ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЎЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарэкому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 129 (4381)
ПЯТНІЦА, 10 чэрвеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 83

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АБ ДЗЯРЖАЎНАЙ УНУТРАНОЙ ПАЗЫЦЫ ЧАЦЬВЕРТАГА, ЗАВЯРШАЛЬНАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ (трэцім выпуску дзяржаўнай унутраной пазыкі — «Пяцігодка — за чатыры гады») — пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР (1 стар.).

Аб рэалізацыі пазыкі 4-га, заключнага году пяцігодкі — пастанова ЦК КП(б)Б (1 стар.).

Аб ходзе выкананьня пляну мясазагатовак 2-га кварталу — пастанова ЦК КП(б)Б (1 стар.).

Пра ільготы пасеўшчыкам канапель — пастанова СНК БССР (3 стар.).

АРТЫКУЛЫ: А. ХАЦКЕВІЧ — Пазыка пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва (1 стар.). Д. ЧУДНОЎСКІ — Асноўныя праблемы электрыфікацыі БССР (2 і 3 стар.).

МТС павінны выйсьці на першае месца пасеўнай (2 стар.).

Партыйнае будаўніцтва (3 стар.).

Рэзалюцыя пратэсту рабочых заводу імя Варашылава супроць разгрому ТБШ. Новы румынскі ўрад (4 стар.).

ІДУЧЫ НА СУСТРАЧ ЗАПАТРАБАВАНЬНЯМ РАБОЧЫХ ПЕРАДАВЫХ ЗАВОДАЎ І КАЛГАСЬНІКАЎ, САЮЗНЫ УРАД ВЫПУСЬЦІЎ ПАЗЫКУ „ЧАЦЬВЕРТЫ ЗАКЛЮЧНЫ"

Адкажам на пастанову ўраду поўнай рэалізацыяй новай пазыкі—магутнага ўкладу ў ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

аб дзяржаўнай унутраной пазыцы чацьвертага, завяршальнага году пяцігодкі (трэцім выпуску дзяржаўнай унутраной пазыкі—„Пяцігодка ў 4 гады"

Рабочая кляса, калгаснае сялянства і ўсе працоўныя СССР пераможна завяршаюць у 1932 годзе пабудову пяцігодкі сацыялістычнага будаўніцтва.

Значную ролю ў накапленьні сродкаў для справы сацыялістычнага будаўніцтва, для завяршэньня пяцігодкі ў чатыры гады, адыграла пасьпяховае разьвіцьцё дзяржаўнага кредыту (савецкіх унутраных пазык), які апіраецца на вялікае давер'е шырокіх мас працоўных да палітыкі камуністычнай партыі і савецкай улады, і актыўны ўдзел гэтых мас у сацыялістычным будаўніцтве.

Пазыка 1931 году (трэцяга рашаючага году пяцігодкі), выпуск якой быў прадугледжан у суме 1,6 мільярда руб., была рэалізавана ў нябывала кароткі тэрмін на суму ў 2 мільярды рублёў.

У інтарэсах пасьпяховага завяршэньня першай пяцігодкі ў 1932 годзе і прыступу да грандыёзнага будаўніцтва другога пяцігадовага пляну — пляну пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, ідучы насустрач шматлікім патрабаваньням рабочых перадавых заводаў і буйных пабудоў і перадавых калгасьнікаў — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

I. Сума, тэрмін, структура і парадак рэалізацыі пазык

Выпусьціць на суму 3 мільярды 200 млн. руб. тэрмінам на 10 год — з 1-га сьнежня 1932 г. па першага сьнежня 1942 году, тую частку дзяржаўнай унутраной пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады», якая прызначана для рэалізацыі ў 1932-1933 г. г. (трэці выпуск дзяржаўнай унутраной пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады»).

Назваць гэту частку: «Дзяржаўная ўнутраная пазыка чацьвертага заключнага году пяцігодкі».

2. Пазыка складаецца з двух выпускаў: а) бяспройгрышнай (бяспроцантнай) і б) процантнай (без выйгрышаў).

Народны Камісарыят Фінансаў СССР разьмяркоўвае суму пазыкі паміж бяспройгрышным і процантным выпускамі, у адпаведнасьці з вынікамі падпіскі па кожным выпуску пазыкі.

3. Пазыка выпускаецца ў аблігацыях, вартасьцю ў 100 руб. кожная — непадзельных і дзялімых на часткі.

Дзялімыя аблігацыі бяспройгрышнага выпуску выпускаюцца трох відаў:

а) з падзелам кожнай аблігацыі на 2 роўныя часткі (па 50 руб.);

б) з падзелам кожнай аблігацыі на 4 роўныя часткі (па 25 руб.);

в) з падзелам кожнай аблігацыі на 10 роўных частак (па 10 руб.).

Дзялімыя аблігацыі процантнага выпуску выпускаюцца двух відаў:

а) з падзелам кожнай аблігацыі на 4 роўныя часткі (па 25 руб.) і

б) з падзелам кожнай аблігацыі на 10 роўных частак (па 10 руб.).

Асобныя часткі дзялімай аблігацыі маюць аднолькавы нумар і зварочваюцца самастойна.

Частка дзялімай аблігацыі бяспройгрышнага выпуску дае права на адпаведныя долі (½, ¼, 1/10 выйгрышу, які прыпаў на цэлую аблігацыю.

Частка дзялімай аблігацыі процантнага выпуску дае права на адпаведную долю (¼, 1/10 процантнага даходу, які прылічваецца на цэлую аблігацыю.

4. Абодвы выпускі пазыкі падзяляюцца на разрады па 100 мільёнаў руб. у кожным разрадзе. Кожны разрад бяспройгрышнага выпуску падзяляецца на 20 тыс. сэрый па 50 сторублёвых аблігацый у кожнай сэрыі.

Кожны разрад процантнага выпуску падзяляецца на 100 тыс. сэрый па 10 сторублёвых аблігацый у кожнай сэрыі.

5. Парадак і ўмовы рэалізацыі пазыкі «4 заключнага году пяцігодкі» ўстанаўляюцца Народным Камісарыятам Фінансаў СССР.

II. Бяспройгрышны выпуск

6. Увесь даход па аблігацыях бяспройгрышнага выпуску выплачваецца ў відзе выйгрышаў. На працягу 10-гадовага тэрміну пазыкі кожная аблігацыя абавязкова выйграе.

Выйгрышы ўстанаўляюцца ў 3.000, 1.000, 500, 200 і 100 руб. па аблігацыю вартасьцю ў 100 руб.

РАЗЬМЕР ВЫЙГРЫШУ	У 1-м годзе: У 1—4 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума	У 2-м годзе: У 5—8 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума	У 3-м годзе: У 9—12 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума
3.000	2	6000	2	6000	2	6000
1.000	10	10000	10	10000	10	10000
500	20	10000	20	10000	20	10000
200	500	100000	550	110000	600	120000
100	11468	1146800	11918	1191800	12368	1236800
УСЯГО	12000	1272800	12500	1327800	13000	1382800

РАЗЬМЕР ВЫЙГРЫШУ	У 4-м годзе: У 13—16 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума	У 5-м годзе: У 17—20 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума	У 6-м годзе: У 21—24 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума
3.000	2	6000	2	6000	3	9000
1.000	10	10000	10	10000	15	15000
500	20	10000	20	10000	20	15000
200	650	130000	700	140000	800	160000
100	12818	1281800	13768	1376800	15152	1515200
УСЯГО	13500	1437800	14500	1542800	16000	1714200

РАЗЬМЕР ВЫЙГРЫШУ	У 7-м годзе: У 25—28 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума	У 8-м годзе: У 29—32 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума	У 9-м годзе: У 33—36 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума
3.000	3	9000	3	9000	3	9000
1.000	15	15000	15	15000	15	15000
500	30	15000	30	15000	30	15000
200	900	180000	1000	200000	1100	220000
100	23052	2305200	36452	3645200	50852	5085200
УСЯГО	24000	2524200	37500	3884200	52000	5344200

РАЗЬМЕР выйгрышу	У 10 годзе: у 37-40 тыражох разыгр. у кожным — Колькасьць выйгр.	Сума
3.000	3	9000
1.000	15	15000
500	30	15000
200	1200	240000
100	53752	5375200
Усяго	55000	5654200

7. Аблігацыя, на якую прыпадае выйгрыш, выключаецца з далейшых тыражоў выйгрышаў.

Па выплаце выйгрышу аблігацыя зварочваецца яе трымальніку для атрыманьня па ёй намінальнага кошту, які выплачваецца ў наступныя тэрміны:

Намінальны кошт аблігацый, выйграўшых у 1-4 тыражох	(у 1 г.)	выплачваецца з 1	XII-36 г.
„ „ у 5-8 „	(у 2 г.)	выплачваецца з 1	XII-37 г.
„ „ у 9-12 „	(у 3 г.)	выплачваецца з 1	XII-38 г.
„ „ у 13-16 „	(у 4 г.)	выплачваецца з 1	XII-39 г.
„ „ у 17-20 „	(у 5 г.)	выплачваецца з 1	XII-40 г.
„ „ у 21-24 „	(у 6 г.)	выплачваецца з 1	XII-41 г.
„ „ у 25-40 „	(у 7-10 г.)	выплачваецца з 1	XII-42 г.

сьнежня 1947 г. Пасьля сканчэньня гэтага тэрміну трымальнікі аблігацый губляюць права атрымаць выйгрыш.

Прад'яўленьне аблігацый для атрыманьня іх намінальнага кошту (арт. 7) тэрмінам не абмяжоўваецца.

8. Парадак 1 тэрміны правядзеньня тыражоў выйгрышаў (арт. 6) устанаўляюцца Народным Камісарыятам Фінансаў Саюзу ССР.

9. Выплата выйгрышаў, якія прыпалі на аблігацыі бяспройгрышнага выпуску (арт. 6), праводзіцца да 1-га сьнежня 1947 г. Пасьля сканчэньня гэтага тэрміну трымальнікі аблігацый губляюць права атрымаць выйгрыш.

Прад'яўленьне аблігацый для атрыманьня іх намінальнага кошту (арт. 7) тэрмінам не абмяжоўваецца.

III. Процантны выпуск

10. Увесь даход па аблігацыях процантнага выпуску выплачваецца ў выглядзе процантаў па купонах.

11. Па аблігацыях налічваюцца 10 проц. у год. Уплата процантаў праводзіцца адзін раз у год па купоне, тэрмінаваным 1 сьнежня кожнага году, пачынаючы з 1 сьнежня 1933 г.

12. Пагашэньне аблігацый процантнага выпуску пачынаецца з 1-га сьнежня 1935 г. і праводзіцца на працягу 7 год штогоднымі тыражамі пагашэньня. У кожным тыражу пагашаецца па 1/10 сумы выпуску; непагашаная рэшта 3/10 сумы выпуску выкупаецца, пачынаючы з 1 сьнежня 1942 году.

Тэрміны і парадак правядзеньня тыражоў пагашэньня, а таксама парадак выкупу аблігацый устанаўляюцца Народным Камісарыятам Фінансаў Саюзу ССР.

13. Намінальны кошт аблігацый, выпаўшых у тыраж пагашэньня, выплачваецца, пачынаючы з 1 сьнежня таго году, у якім праходзіў тыраж пагашэньня. З гэтага-ж тэрміну спыняецца налічэньне процантаў па аблігацыях, выпаўшых у тыраж.

14. Купоны па аблігацыях процантнага выпуску (арт. 11) могуць быць прад'яўлены да аплаты да 1-га сьнежня 1947 г. Пасьля сканчэньня гэтага тэрміну трымальнікі купонаў губляюць права атрымаць плацяжы па купонах. Прад'яўленьне аблігацый процантнага выпуску для атрыманьня іх намінальнага кошту (арт. 13) тэрмінам не абмяжоўваецца.

IV. Ільготы і ўмовы звароту аблігацый пазыкі „Чацьвертага, завяршальнага году пяцігодкі"

15. На аблігацыі пазыкі «Чацьвертага, завяршаючага году пяцігодкі» распаўсюджваюцца ільготы і ўмовы звароту (продажу і залогу), устаноўленыя арт. арт. 16-19 пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР аб выпуску дзяржаўнай унутраной выйтрышнай пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» (З. З. СССР 1930 г. № 35 арт. 379).

V. Адлічэньні ў дзяржаўныя бюджэты саюзных рэспублік, у мясцовыя бюджэты і на патрэбы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва РСЧА і РС міліцыі

16. Ад сум, атрыманых за аблігацыі пазыкі «Чацьвертага, завяршаючага году пяцігодкі» ўстанаўліваюцца адлічэньні ў дзяржаўныя бюджэты саюзных рэспублік і мясцовыя бюджэты.

17. У дзяржаўныя бюджэты саюзных рэспублік адлічваюцца 15 проц. сумы пазыкі, размешчанай сярод рабочых і служачых на тэрыторыі кожнай саюзнай рэспублікі.

18. Адлічэньні ў мясцовыя бюджэты праводзяцца ў наступных разьмерах:

а) ад сумы пазыкі, размешчанай сярод рабочых і служачых як у гарадзкіх, так і ў сельскіх мясцовасьцях адлічваюцца 10 проц.,

б) ад сумы пазыкі, размешчанай сярод іншага насельніцтва — 25 проц.

Паказаныя адлічэньні ў гарадох і рабочых пасёлках паступаюць поўнасьцю ў мясцовыя бюджэты гэтых гарадоў і пасёлкаў, а ў сельскіх мясцовасьцях размяркоўваюцца райвыканкомамі паміж раённымі і сельскімі бюджэтамі з тым, каб у кожны сельскі бюджэт паступіла ня менш 15 проц. ад сумы пазыкі, якая размешчана сярод сялянскага насельніцтва на тэрыторыі, якая ахапляецца сельсаветам.

Там, дзе няма самастойных сельскіх бюджэтаў, устаноўленыя для іх адлічэньні паступаюць у раённы бюджэт.

19. Адлічэньні ў дзяржаўныя бюджэты саюзных рэспублік і ў мясцовыя бюджэты ідуць на патрэбы гаспадарчага, культурнага будаўніцтва данай рэспублікі, гораду, раёну, або сяла.

20. Ад сум, атрыманых за аблігацыі пазыкі «Чацьвертага, завяршаючага году пяцігодкі», размешчаныя ў часьцях і ўстановах рабоча-сялянскай Чырвонай арміі (у тым ліку аб'яднанага Дзяржаўнага Палітычнага Упраўленьня і канвойных войск Саюзу ССР), а таксама сярод работнікаў Рабоча-Сялянскай міліцыі адлічваецца 10 проц. на патрэбы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва РСЧА і РС Міліцыі.

21. Народны Камісарыят Фінансаў Саюзу ССР выдае інструкцыю аб парадку правядзеньня адлічэньняў у рэспубліканскія і мясцовыя бюджэты і на патрэбы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва РСЧА і РС Міліцыі.

Старшыня ЦВК СССР — КАЛІНІН.

Нам. старшыні СНК СССР — КУЙБЫШАЎ.

В. а. сакратара ЦВК СССР — МЯДЗЬВЕДЗЕЎ.

Масква, Крэмль,
7 чэрвеня 1932 г.

Пазыка пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва

Наперакор «прароцтвам» буржуазных эканамістаў і прадказаньням правых і «левых» апартуністаў, рабочая кляса і працоўнае сялянства Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі, з посьпехам заканчваюць першую пяцігодку і, узброеныя вопытам барацьбы на фронце будаўніцтва сацыялізму, бажёра і цьвёрда падыходзяць да другой пяцігодкі пабудовы бясклясавага грамадзтва.

Нашчэпт разьбіты надзеі клясавых ворагаў на крах сацыялістычнага будаўніцтва, на развал фінансавай гаспадаркі Саюзу.

Дзякуючы творчаму энтузіязму пралетарыяту і калгасных мас, дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі, ленінскай нацыянальнай, завершана пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі, заваёўваюцца подступы да другой пяцігодкі.

Расьце і мацнее сацыялістычная гаспадарка ў СССР. Пад ударамі крызісу разваліваецца і руйнуецца гаспадарка ва ўсіх капіталістычных краінах.

Будуючы адзін за адным новыя гіганты сацыялістычнай індустрыі, Савецкі саюз ажыцьцяўляе лёзунг «у самы кароткі гістарычны тэрмін дагнаць і перагнаць перадавыя ў тэхнічных адносінах капіталістычныя краіны».

На аснове індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, шырокага ўжываньня машынной тэхнікі, Савецкі саюз ператварыўся з краіны дробнага зямляробства ў краіну самага буйнога ў сьвеце сацыялістычнага зямляробства.

Цалкам ліквідавана беспрацоўе. Заканчваецца ліквідацыя няпісьменнасьці, уводзіцца ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе сямігодкі. Усё больш паляпшаецца дабрабыт працоўных мас краіны.

Чым больш мацнее сацыялістычная гаспадарка, чым больш паляпшаецца дабрабыт працоўных, тым больш павялічваюцца ўкладаньні мас у справу сацыялістычнага будаўніцтва. Ня толькі сваёй творчай працай, але і сваімі ўласнымі сродкамі пралетарыят і працоўнае сялянства будуюць сацыялізм.

Рэалізацыя масавых дзяржаўных пазык па Савецкім саюзе дала ў 1927 годзе 200 млн. руб., у 1928 г. — 507 млн., у 1929 г.—942 млн., у 1930 г. —1.047 млн., у 1931 г. — 2.035 млн. руб. Па БССР адпаведна — 2,7 млн. руб., 10,3 млн. руб., 18 млн., 20,1 млн., 44,6 млн. руб.

Вось чаму мы будуем нашы фінансавыя пляны з разьлікам на шырокае добраахвотнае ўцягненьне ў справу сацыялістычнага будаўніцтва вольных сродкаў самога насельніцтва. З кожным годам няўхільна зьніжаецца доля абавязковых плацяжоў у плянах мабілізацыі сродкаў. У 1930 г. яны займалі 48 проц., у 1931 — 44 проц., у 1932 г. толькі 36 проц. Фінансавы плян чацьвертага, заключнага году — гэта **«сьмелая стаўка на грамадзкую самадзейнасьць працоўных мас, пэўны разьлік на папулярнасьць нашай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва» (ГРЫНЬКО).**

Выпушчаная зараз паводле ініцыятывы і патрабаваньняў перадавых пралетараў і калгасьнікаў Савецкага саюзу, пазыка «чацьвертага, заключнага году» зьяўляецца важнейшай неадлучнай часткай праграмы мабілізацыі сродкаў бягучага году.

Пасьпяховая рэалізацыя гэтай пазыкі мае выключна-важнае значэньне. У бягучым годзе мы завяршаем першую бальшавіцкую пяцігодку. Пазыка «чацьверты, заключны» зьяўляецца самым буйным грашовым укладам працоўных у справу барацьбы за тэхнічна-эканамічную незалежнасьць Саюзу.

Закон, выданы ЦВК і СНК Саюзу, прадугледжвае адлічэньне ў дзяржаўны і мясцовы бюджэт СССР 25 проц ад сумы рэалізацыі пазыкі па БССР. Такім чынам, ад нашага ўдзелу ў рэалізацыі пазыкі, ад выпікаў кампаніі ў значнай меры будзе залежыць разьмер сродкаў, якія мы зможам атрымаць і накіраваць на паскарэньне тэмпаў гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва, на далейшае паляпшэньне сацыяльна - бытавых умоў рабочых мас і працоўнага насельніцтва Савецкай Беларусі.

Для таго, каб пасьпяхова правесьці рэалізацыю новай пазыкі, неабходна шырокая мабілізацыя ўсіх сіл. Партыйныя, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія і ўсе грамадзкія арганізацыі павінны разгарнуць вялікую арганізацыйна - масавую работу. Асабліва значэньне набывае актыўны ўдзел у справе распаўсюджаньня пазыкі перадавікоў фабрык, заводаў, саўгасаў і калгасаў, асабліва ўдарнікаў і ўдарніц фінансавага фронту. Мы маем па БССР звыш 15.000 ударнікаў фінансавага фронту, якія на справе даказалі сваю адданасьць задачам бесьперабойнага фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва. Кожны перадавы рабочы і калгасьнік, кожны партыйны і прафэсыянальны работнік, кожны ўдарнік фінансавага фронту павінен быць ініцыятарам сацыялістычнага спаборніцтва гарадоў, фабрык, заводаў, цэхаў, брыгад, раёнаў, сельсаветаў, калгасаў і вёсак на лепшае і хутчэйшае выкананьне пляну рэалізацыі.

Асабліва важна разгарнуць шырокую растлумачальную і арганізацыйна-масавую работу на вёсцы.

Вёска да апошняга часу адставала ў адносінах рэалізацыі дзяржаўных пазык. Між тым, грашовыя даходы вясковага насельніцтва шпарка ўзрастаюць. **Апошнія пастановы партыі і ўраду аб загатоўках збожжа і жывёлы і разгортваньні калгаснага гандлю павінны выклікаць далейшае значнае павялічэньне грашовых даходаў вясковага насельніцтва.** Ня гледзячы на павялічэньне дзяржаўных укладаньняў у сельскую гаспадарку, сельгаспадатак у бягучым годзе ня толькі не павялічваецца, а назат зьніжаецца ў параўнаньні з мінулым годам. Вёска мае такім чынам усе прадпасылкі для пасьпяховай рэалізацыі новай пазыкі.

Разгарнуць так работу, каб ня было ні аднаго працоўнага без аблігацыі пазыкі «чацьвертага заключнага» — абавязак усёй пралетарскай грамадзкасьці.

Партыйныя і савецкія органы на мясцох павінны стаць на чале гэтай важнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніі.

Трэба адкінуць думку аб тым, што рэалізацыя пазыкі датычыць толькі апарату ашчадкасы. Усе зьвяньні фінансавага і крэдытнага апарату, кожны фінансава-крэдытны работнік пасобку павінны быць у перадавых радох байцоў за пасьпяховае выкананьне пляну рэалізацыі пазыкі.

Вялікія абавязкі падаюць на камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту, якія павінны стаць вядучымі зьвеньнямі кампаніі рэалізацыі.

БССР заваявала рад перамог на фінансавым фронце.

Замацаваць і пашырыць гэтыя посьпехі баявымі тэмпамі рэалізацыі пазыкі «чацьверты заключны» — ганаровая задача ўсёй нашай грамадзкасьці.

А. ХАЦКЕВІЧ.

Аб ходзе выкананьня пляну мясазагатовак 2-га кварталу

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Адзначыць, што ход выкананьня пляну 2-га кварталу ў чэрвені месяцы нездавальняючы. Асабліва срываюць загатоўкі раёны: Асіпавіцкі—22 проц., Брагінскі—20 проц., Б.-Кашалёўскі—21 проц., Бягомльскі—26 проц., Быхаўскі — 31 проц., Бялыніцкі—29 проц., Веткаўскі—33 проц., Віцебскі—32 проц., Гарадоцкі—27 проц., Дубровенскі—33 проц., Жлобінскі—30 проц., Церахаўскі—25 проц., Чаўскі—27 проц., Каралінскі—32,7 проц., Чырвонапольскі—16,4 проц., Клічаўскі—24,7 проц., Лельчыцкі—26%, Нараўлянскі—26 проц., Пятрыкоўскі—25 проц., Пухавіцкі—32 проц., Прапойскі—19 проц., Рэчыцкі—28 проц., Сіроцінскі—30 проц., Талачынскі—31 проц., Чачэрскі—26 проц.

ЦК катэгарычна папярэджвае гэтыя раёны аб неабходнасьці дабіцца кашчучага пералому ў мясазагатоўках, забясьпечыць 100 проц. выкананьне пляну мясазагатовак да 1 ліпеня.

2. За асабліва ганебныя тэмпы ў мясазагатоўках і невыкананьне дырэктыў ЦК і СНК па мясазагатоўках па Брагінскім раёне (выкананьне 20 проц.), старшыні райвыканкому тав. Анікейчыку абвясьціць суровую вымову. Загадчыка райканторай Загатжывёлы Брагінскага раёну з работы вызьняць і перадаць суду. Прасіць ЦКК КП(б)Б разабраць пытаньне аб магчымасьці яго прабываньня ў КП(б)Б.

3. За зрыў у выкананьні мясазагатовак па Чырвонапольскім раёне, ня гледзячы на неаднаразовыя папярэджаньні ЦК і СНК, сакратару райкому КП(б)Б т. Шатуну абвясьціць вымову.

Былога загадчыка райканторай Загатжывёлы Чырвонапольскага раёну тав. Емельяненка за бязьдзейнасьць і срыў пляну мясазагатовак перадаць суду. Прасіць ЦКК КП(б)Б разабраць пытаньне аб магчымасьці яго далейшага прабываньня ў КП(б)Б.

ЦК папярэджвае кіраўніка Загатжывёлы тав. Рошаля, што ён, як кіраўнік абавязан зараз-жа прыняць меры ў адносінах тых сваіх работнікаў, якія дрэнна выконваюць пастановы партыі і ўраду.

4. Сакратаром РК КП(б)Б Асіпавіцкага і Б.-Кашалёўскага раёнаў за слабыя тэмпы мясазагатовак паставіць на від.

5. Указаць сакратару Пятрыкоўскага РК КП(б)Б і старшыні Пятрыкоўскага РВК аб недапушчальнасьці такіх тэмпаў выкананьня пляну мясазагатовак.

6. Абавязаць райкомы КП(б)Б, Сьвіраводкалгасцэнтр т. Красоўскага ў 10-цідзенны тэрмін скончыць дагаворную кампанію ў сьвінатаварных калгасных фэрмах па здачы таварнай прадукцыі дзяржаве. Даручыць Камісіі выкананьня праз 10 дзён заслухаць даклад тав. Красоўскага аб выкананьні гэтай дырэктывы.

7. Ня гледзячы на неаднаразовыя катэгарычныя ўказаньні ЦК і СНК аб забароне звышпланавай выдачы мяса каму-бы там ні было, таксама і разбазарваньне, раёны Жыткавіцкі, Пятрыкоўскі, Веткаўскі парушылі гэту пастанову. Веткаўская райкантора разбазарыла 911 клгр. мяса, Жыткавіцкая райкантора перадала звыш нарадаў 250 цнт., Пятрыкоўская райкантора—10 цнт. Кіраўнікоў памянёных райкантор і райспажываў Жыткавіцкага, Пятрыкоўскага і Веткаўскага раёнаў перадаць суду. Абавязаць Белмяспрамтрэст выданае мяса звыш нарадаў залічыць у лік будучых нарадаў.

8. З прычыны таго, што Бярэзінскі раён, які адставаў у першым квартале па мясазагатоўках, выканаў плян 2-га кварталу на 5-VI—96,3 проц., з сакратара РК тав. Славіка даную яму вымову зьняць.

9. Тэлеграмы РК КП(б)Б пасеўпаўпаважаным членам бюро ЦК КП(б)Б зацьвердзіць.

10. Лічыць неабходным друкаваньне ў цэнтральных газэтах «Зьвязда», «Савецкая Беларусь» чорнай дошкі адстаючых раёнаў.

11. Пастанову апублікаваць у друку.

Аб рэалізацыі пазыкі „чацьвертага заключнага году пяцігодкі"

Пастанова ЦК КП(б)Б

Выкананьне праграмы сацыялістычнага будаўніцтва чацьвертага, заключнага году пяцігодкі, бальшавіцкае ўступленьне ў другую пяцігодку — пяцігодку пабудовы бясклясавага грамадзтва, завяршэньне сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй гаспадаркі на базе навейшай тэхнікі патрабуюць максымальнага ўзмацненьня фінансавай базы.

У адказ на запатрабаваньне лепшых ударнікаў сацыялістычнага будаўніцтва аб выпуску новай пазыкі—пазыкі бальшавіцкіх перамог, урад СССР пастанавіў выпусьціць масавую пазыку «чацьвертага, завяршаючага году пяцігодкі» ў суме 3,2 мільярда руб.

Поўнае выкананьне пляну рэалізацыі пазыкі, вызначанай па БССР у суме 67,5 млн. руб. і для чыгуначнікаў у 2,7 млн. руб. (у цэнтралізаваным парадку) патрабуе ад усіх партарганізацый выразнага і апэрацыйнага кіраўніцтва, шырокага разгортваньня масава-палітычнай работы, узмацненьня арганізуючай ролі камсамольскіх, прафсаюзных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый па забясьпячэньні масавага правядзеньня кампаніі, пры захоўваньні асноўнага прынцыпу рэалізацыі пазыкі — добраахвотнасьці.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б узяць пад сваё непасрэднае кіраўніцтва і ўстанавіць неаслабны кантроль за работай па рэалізацыі пазыкі, праводзячы яе, як важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію, сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі з тым, каб на працягу чэрвеня завяршыць кампанію рэалізацыі пазыкі ў горадзе і ў вёсцы.

2. Пытаньне аб значэньні новай пазыкі і мэтадах яе рэалізацыі прапрацаваць на адкрытых партыйных, камсамольскіх і дэлегацкіх сходах жанчын, сходах шырокага прафактыву, сходах рабочых, служачых, калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў — аднасобнікаў.

3. ГК і РК КП(б)Б умацаваць ашчадкасы моцнымі кадрамі, здольнымі забясьпечыць арганізацыю і правядзеньне кампаніі, замацаваўшы іх за ашчадапаратам, не адрываючы на іншыя работы.

4. Улічваючы вялізарную ролю камісій садзейнасьці — асноўнага зьвяна грамадзкасьці фінфронту — у правядзеньні гэтай кампаніі, асабліву ўвагу зьвярнуць на ўмацаваньне сыстэмы камісій садзейнасьці лепшымі ўдарнікамі, рабочымі, калгасьнікамі і актывістамі.

5. ЦК ЛКСМБ, пад адказнасьць тав. ГЕРЦОВІЧА, забясьпечыць актыўны ўдзел усёй камсамольскай арганізацыі—шэфа ашчадсправы ў кампаніі рэалізацыі пазыкі, увязаўшы гэту работу з камсамольскім фінпаходам, які зараз праводзіцца і надыходзячым усебепарускім зьлётам камсамольцаў — ударнікаў фінфронту, паслаўшы на дапамогу мясцом камсамольскія брыгады актывістаў.

Забясьпечыць шырокі ўдзел піянэраў і вучняў у кампаніі, скарыстоўваючы ўсе формы піянэрработы.

6. ЦСПСБ, пад адказнасьць тав. КАВАЛЁВА, у адпаведзенны тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па забясьпячэньні актыўнага ўдзелу прафсаюзаў у кампаніі, вылучыўшы члена прэзыдыуму, адказнага за яе правядзеньне (прозьвішча члена прэзыдыуму паведаміць у агітмасавы аддзел). Для аказаньня дапамогі мясцовым арганізацыям у апэрацыйнай работе па рэалізацыі пазыкі, вылучыць на ўвесь тэрмін кампаніі ня менш 25 адказных работнікаў.

Забясьпечыць актыўную і непасрэдную дапамогу прафсаюзнай масы сельсаветам, саўгасам, МТС і калгасам у правядзеньні кампаніі, арганізаваць праз сыстэму шэфработы ў дні адпачынку агітпаходы прафактыву ў вёску.

7. Абавязаць ЦСПСБ і ЦП саюзаў, якія абслугоўваюць сэзонных рабочых, разгарнуць масавую работу па поўным охопе падпіскай на пазыку ўсіх сэзонных кінкаў, распрацаваўшы канкрэтныя формы і мэтады правядзеньня кампаніі.

8. Калгасцэнтру в 2-хдзенны тэрмін распрацаваць і накіраваць на месца канкрэтны плян рэалізацыі пазыкі сярод шырокіх калгасных мас. Асабліву ўвагу зьвярнуць на актывізацыю калгасных камсодаў, разгортваньне масавай работы і сацыялістычных яе форм — сацпаборніцтва і ўдарніцтва. Вылучыць члена праўленьня КГЦ, адказнага за правядзеньне кампаніі па калгассыстэме, паведаміўшы аб гэтым агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б.

9. ЦСПСБ і Калгасцэнтру вызначыць перадавыя вядучыя пункты (брыгады, групы, агрэгаты, прадпрыемствы, саўгасы, МТС і калгасы), пераносячы вопыт іх работы на адстаючыя вучасткі. Шырока скарыстаць ініцыятыву ўдарнікаў фінфронту. Арганізаваць сацпаборніцтва і ўдарніцтва па рэалізацыі пазыкі і канкрэтна кіраваць ёю.

10. Белкаапсаюзу забясьпечыць актыўны ўдзел усёй каапэрацыйнай сеткі ў кампаніі, шырока скарыстоўваючы савецка - калгасныя рынкі ў мэтах папулярызацыі пазыкі. У 2-дзенны тэрмін даць сетцы разгорнуты плян работы.

11. Абавязаць Белрадыёцэнтр забясьпечыць сыстэматычныя радыёперадачы перакліч і іншыя формы работы аб ходзе кампаніі.

12. Белдзяржкіно забясьпечыць папулярызацыю кампаніі праз кінэздымкі, хроніку ходу кампаніі, здымкі перадавікоў, ударнікаў фінфронту, якія дасягнулі лепшых вынікаў у барацьбе за новую пазыку.

13. Цэнтральным органам усіх добраахвотных таварыстваў у 2-дзенны тэрмін разаслаць на месцы канкрэтныя распрацаваныя плямы правядзеньня кампаніі і забясьпечыць удзел у ёй усіх членаў таварыстваў.

14. НКФ устанавіць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва і ўлік ходу кампаніі. Вылучыць грашовы фонд для прэміяваньня лепшых вучасткаў, і асоб, якія ўдарна выканаюць заданьне па рэалізацыі пазыкі.

15. Цэнтральнаму, раённаму і кізавому друку арганізаваць шырокую грамадзкасьць на правядзеньне кампаніі, разгарнуўшы масавую работу, і штодзенна асьвятляць ход кампаніі, паказваючы лепшыя прыклады работы, пераносячы вопыт перадавых прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў і сельсаветаў на адстаючыя вучасткі.

16. Пастанову апубліка...

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

МТС павінны выйсьці на першае месца пасеўнай

Пры дапамозе Ленінскага Камсамолу Беларусі—выканаць пасеўныя пляны на 100 проц. у бліжэйшыя-ж дні

ХОД СЯЎБЫ ПА СЭКТАРОХ

	На 30 мая		На 5 чэрвеня
Аднаасобнікі	56,3 проц.	Аднаасобнікі	72,2 проц.
Калгасы	51,6 „	МТС	70,6 „
МТС	48,5 „	Калгасы	65,5 „
Саўгасы	39,6 „	Саўгасы	47,5 „

НІ АДНЭЙ МІНУТЫ ПРАСТОЮ ТРАКТАРАЎ

Апошняя пяцідзёўка адзначаецца значным зрухам у ходзе сяўбы па МТС. Калі апошняя пяцідзёўка мая дала прырост на 17,9 проц., дык за першую пяцідзёўку чэрвеня мы маем прырост на 22,1 проц. Усяго на 5-га чэрвеня засеяна 319.291 га, або 70,6 проц. плану.

Такім чынам МТС выходзяць ў першыя рады пасеўнай і занялі другое месца пасьля аднаасобнага сэктару. На 5 чэрвеня поўнасьцю скончылі сяўбу **Ветрынская МТС** — 100 проц., **Танежыцкая** — 100,1 проц. і **Жыткавіцкая** — 100 проц. Заваршаюць сяўбу **Тураўская**, якая засеяла 96,5 проц. і **Мсьціслаўская** — 91,2 проц.

Няма сумненьня, што рад МТС дабіўся значнага зруху ў рэзультаце рашучага павароту тварам да вытворчасьці, дзякуючы ўзмацненьню канкрэтнага і аперацыйнага кіраўніцтва кожным вытворчым вучасткам, трактарным атрадам. Трэба адзначыць, што значную ролю ў гэтым зруху адыграла дапамога МТС з боку камсамолу БССР. Разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, пасылка ў дапамогу МТС механікаў, трактарыстаў і разгортваньне шырокай масавай работы ўжо далі свае рэзультаты.

Аднак, трэба прызнаць, што некаторыя МТС усё яшчэ вядуць сяўбу недапушчальна марудныя тэмпамі. З 18 МТС, якія намі былі занесены на чорную дошку, зьнімаюцца толькі 3: **Лепельская, Бяльніцкая і Касьцюковіцкая.** Астатнія 15 МТС не зрабілі адпаведных вынадаў і не разгарнулі бальшавіцкай барацьбы на фронце пасеўнай. Асабліва ў гэтым паказалі слабе **Гарадоцкая, Бешанковіцкая, Путчынская, Бягомльская, Віцебская і Барысаўская МТС,** якія не падалі ніякіх адзнак, каб выйсьці ў першыя рады. Яны засталіся на ранейшых сваіх мясцох. Яшчэ горшыя паказальнікі дае **Расонская** МТС, якая замест прасоўваньня ўперад з 17 месца перашла на 18 месца, **Полацкая** — з 12 на 17 месца і **Сурасная**—з 13 на 14 месца.

Матар'ялы, зьмешчаныя ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» аб ходзе камсамольскага штурму па МТС, з усёй відавочнасьцю выкрываюць прычыны ганебнага адставаньня некаторых МТС. Прастоі трактараў, частыя паломкі з-за няхайных адносін да машын, адсутнасьць належнай дыспыпліны, дзякуючы сярод трактарыстаў, якая выклікаецца няўважлівымі адносінамі некаторых кіраўнікоў МТС да матар'яльна-бытавых умоў рабочых і г. д. усё яшчэ маюць месца ў практыцы работы МТС і тармозяць пасьпяховае сканчэньне пасеўнай кампаніі.

Задача ўсіх раённых арганізацый, МТС, кожнага трактарыста і камсамольца — замацаваць дасягнутыя ў першую пяцідзёўку чэрвеня посьпехі і на аснове рашучай перабудовы работы ў МТС ліквідаваць выяўленыя недахопы і ў бліжэйшыя дні скончыць сяўбу

Ні адзнэй мінуты прастою трактараў, поўная ліквідацыя паломак і ўдарныя нормы выпрацоўкі — вось паказальнікі, рэалізацыя якіх прывядзе да перамогі МТС на фронце пасеўнай.

Зводка Трактарацэнтру

аб ходзе веснавой сяўбы па МТС БССР на 5 чэрвеня 1932 г.

№№ п. п.	НАЗВА МТС	Засеяна ў гектарах.	Проц. выканан.
	ІЛЬНА-МАЛОЧНЫЯ МТС:		
1.	Ветрынская	9.034	100
2.	Мсьціслаўская	10.279	91,2
3.	Лёзьнянская	9.996	81,8
4	Чашніцкая	5.852	79,9
5.	Дрысенская	5.201	74,2
6.	Горкавіцкая	5.585	72,9
7.	Чаўсская	5.330	67,7
8.	Шклоўская	6.523	66,0
9.	Бяльніцкая	4.932	65,2
10.	Горацкая	8.985	64,0
11	Дуброўенская	6.305	61,2
12.	Лепельская	8.705	60,7
13.	Сеньненская	8.254	60,5
14.	Сурасная	3.850	59,3
15.	Асьвейская	4.052	58,4
16.	Вушацкая	4.900	55,3
17.	Полацкая	4.277	54,4
18	Расонская	4.138	51,7
19.	Сіроцінская	3.846	44,3
20.	Талочынская	4.057	48,8
21.	Бешанковіцкая	2.754	30,2
22.	Гарадоцкая	2.236	28,4
	Усяго:	129.165	63,0
	БУЛЬБЯНА-ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫЯ МТС:		
1.	Танежыцкая	7.794	100,1
2.	Церахаўская	7 572	89,7
3.	Касьцюковіцкая	8.220	82,0
4.	Цялуская	5.935	60,7
5.	Клімавіцкая	12.757	80,7
6.	Слуцкая	6.984	79,3
7.	Пухавіцкая	6.243	73,7
8.	Вуазьдзенская	5 825	72,8
9.	Капыльская	6.682	72,3
10.	Плешчаніцкая	9.082	62,8
11.	Заслаўская	6.460	62,3
12.	Койданаўская	9.870	62,3
13.	Б.-Кашалеўская	5.722	59,2
14.	Жлобінская	3.845	57.8
15.	Рагачоўская	3.325	56,0
16.	Ст.-Дарожская	3.115	54,4
17.	Лагойская	4.643	52,7
18.	Бальшавіцкая	3.526	52,8
19.	Смалявіцкая	5.938	51,5
20.	Бягомльская	3 903	40,1
21.	Путчынская	1.435	16,4
	Усяго	125.860	70,5
	ЖЫВЁЛАГАДОЎЧА-КАНАПЛЯВОДЧЫЯ МТС:		
1.	Жыткавіцкая	5.404	100
2.	Тураўская	2.589	96,5
3.	Старобінская	5.170	70,1
4.	Даманавіцкая	3.957	64,3
5.	Лельчыцкая	1.839	51,7
	Усяго:	118.952	75,3
	САДОВА-ГАРОДНЫЯ МТС:		
1.	Магілеўская	5.125	72,0
2.	Аршанская	6.680	68,0
3.	Менская	5.210	66,1
4.	Рэчыцкая	4.660	64,0
5.	Гомельская	3.863	54,1
6.	Віцебская	3 673	52,1
7.	Барысаўская	2.554	37,2
	Усяго:	31.764	62,1
	ТАБАЧНАЯ МТС:		
1.	Хойніцкая	4.915	82,0
	Усяго па МТС БССР:	319.291	70,6

ЧОРНАЯ ДОШКА

За слабую практычную рэалізацыю 6 умоў т. Сталіна, за дрэнную арганізацыю калгаснай вытворчасьці, за ганебнае адставаньне ў выкананьні пасеўных плянаў пакідаем на чорнай дошцы наступныя МТС:

Ільна-малочныя МТС (проц. вык.—63)

1. **Гарадоцкая** — 28,4 проц., 2) **Бешанковіцкая** — 30,2 проц., 3) **Расонская** — 51,7 проц., 4) **Полацкая**—54,4 проц., 5) **Вушацкая**—55,3 проц., 6) **Асьвейская** — 58,4 проц., **Сурасная** — 59,3 проц., 8) **Талочынская** — 48,8 проц., 9) **Сіроцінская** — 44,3 проц.

Бульбяна-жывёлагадоўчыя МТС (проц. вык.—70,5)

1) **Путчынская** — 16,4 проц., 2) **Бягомльская** — 40,1 проц., 3) **Смалявіцкая** — 51,5 проц.

Садова-гародныя МТС (проц. вык.—62,1)

1. **Барысаўская** — 37,2 проц. 2)**Віцебская** — 52,1 проц., 3) **Лельчыцкая** — 51,7 проц.

ЗЬНІМАЮЦЦА З ЧОРНАЙ ДОШКІ

За ўзмацненьне тэмпаў сяўбы зьнімаюцца з чорнай дошкі наступныя МТС:

1. **Касьцюковіцкая**, якая па бульбяна-жывёлагадоўчых МТС вышла з 3 на 18 месца. На 5 чэрвеня плян выканала на **82 проц.** замест 22,1 проц. на 30 мая.

2) **Бяльніцкая**, якая па ільна-малочных МТС вышла з 18 на 9 месца. На 5 чэрвеня выканала плян на **65,2 проц.**, замест 26 проц. на 30 мая.

3) **Лепельская**, якая па ільна-малочных МТС вышла з 20 на 12 месца. На 5 чэрвеня выканала плян на 60,7 проц., замест 23,7 проц. на 30 мая.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

МТС, якія, на аснове практычнага ажыцьцяўленьня шасьці умоў т. Сталіна, скончылі сяўбу яравых культур:

1. **Танежыцкая** — 100,1 проц.
2. **Ветрынская** — 100 проц.
3. **Жыткавіцкая** — 100 проц

ЧЫРВОНЫ СЬПІС

кандыдатаў на прэміяваньне за лепшае і хутчэйшае правядзеньне веснавой сяўбы

1) **Тураўская** — 96,5 проц., 2) **Мсьціслаўская** — **91,2 проц.**, 3) **Церахаўская** — 89,7 проц., 4) **Касьцюковіцкая** — 82 проц., 5) **Лёзьнянская** — 81,8 проц.

Завоз прамтавараў у перадавыя раёны па сяўбе

Прэзыдыум праўленьня Белкаапсаюзу пастанавіў накіраваць у раёны, якія з посьпехам праводзяць сяўбу, фонд прам тавараў (швэйныя вырабы) на 40.000 рублёў па прайс-курантных цэнах прамысловасьці ў наступныя раёны. Лёзьнянскі, Чырвонаслабодзкі, Старобінскі — па 3.000 руб., Мсьціслаўскі, Шклоўскі—па 2.500 руб., Жыткавіцкі, Тураўскі, Глускі, Чэрвеньскі, Бабруйскі Парыцкі, Ельскі, Капыльскі, Вузьдзенскі, Горацкі—па 2.000 руб., Слуцкі, Клімавіцкі, Аршанскі і Полацкі раёны—па 1.500 р.

Спажыўсаюзам паказаных раёнаў прапанавана гэтыя прамтавары адпускаць па ўзгадненьні з раённымі зямельна-калгаснымі арганізацыямі выключна тым сельсаветам, саўгасам, калгасам, МТС, лепшым ударным брыгадам, брыгадзірам і ўдарнікам, якія з посьпехам закончылі і заканчваюць сяўбу.

Прэзыдыум Белкаапсаюзу абавязаў сэктар снабжэньня пры разьмеркаваньні дадатковага сельскага цэнтралізаванага фонду прамтавараў 2-га кварталу вылучыць пэўную частку фонду на гэтую-ж мэту.

Ветрынская МТС—узор для адстаючых

ПОЛАЦАК.

Ветрынская МТС (Полацкі раён) 7-га чэрвеня поўнасьцю скончыла сяўбу. З першага дня сяўбы і да сканчэньня яна паказвала ўзоры бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пляну. Уся работа праводзілася сацыялістычнымі мэтадамі. Паміж вытворчымі вучасткамі, трактарнымі калёнамі і асобнымі трактарыстамі былі заключаны ўмовы на сацспаборніцтва. Як у дэнтры, так і на вытворчых вучастках кожную пяцідзёўку выпускаюцца насьценныя газэты. Ёсьць дошка тэмпаў, а таксама чорная і чырвоная дошкі. Трактарысты да трактараў адносіліся і адносяцца вельмі беражна.

Камсамольская ячэйка па-бальшавіцку змагалася за выкананьне вытворчых заданьняў МТС, за эканомію змазачнага і гаручага, за вытворчую дысцыпліну.

Зусім інакш стаіць справа ў **Полацкай МТС.** Там сацыялістычныя мэтады працы — ударніцтва і сацспаборніцтва — адсутнічаюць. Працуюць, як каму хочацца.

Наглядаюцца вельмі частыя і доўгія прастоі трактараў. Так, на вытворчым вучастку № 1, чатыры трактары з-за адсутнасьці гаручага прастаялі паўтары сутак, на вытворчым вучастку № 5 два трактары па тэй жа прычыне прасталі двое сутак.

У МТС працуе 8 камсамольцаў. Між тым, Полацкі РК ЛКСМБ не пакланаціўся арганізаваць ячэйку пры МТС і мабілізаваць камсамольцаў на выкананьне пляну веснавой сяўбы.

Усе тэрміны сканчэньня сяўбы прайшлі. Полацкая МТС павінна навучыцца прапускане і ў самы кароткі тэрмін скончыць веснавую сяўбу.

Кароль К.

Калгас імя Гомельскага пралетарыяту скончыў сяўбу

ЛОЕЎ. (Па тэлеграфу). Калгас імя Гомельскага пралетарыяту скончыў сяўбу. Плян засеву — 288 га, засеяна — 291 га. Зараз калгас пераключыўся на прапоўку і падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

За 20.000 га гародніны

БЕЛСЕЛЬГАСАБ'ЯДНАНЬНЕ ФІКСУЕ...

Прыгарадныя гаспадаркі Беларусі, у тым ліку і трэставаныя саўгасы Белкаапсельгасаб'яднаньня ганебна зацягваюць веснавую сяўбу. Раньнія тэрміны сяўбы, асабліва гародніны, даўно прайшлі. На 5 чэрвеня плян выканан усяго на 63,4 проц. Прычым асабліва адстае сяўба гародніны. Калі плян па палявых культурах выканан на 69 проц., дык па гародных—на 52,5 проц.

На 5 чэрвеня ні адна прыгарадная гаспадарка поўнасьцю сяўбы ўсіх культур ня выканала. Гаспадаркі буйных пралетарскіх цэнтраў, як Віцебск, Менск, Гомель сяўбу яшчэ толькі пачынаюць разгортваць. Саўгас «Вольная праца» (Менск), які на плошчы ў 584 га мае 6 трактараў, забясьпечан конскай цягавай сілай і мае ўсе магчымасьці для поўнага забясьпячэньня рабочай сілай, засеяў толькі 50,3 проц. пляну. Прыгарадная гаспадарка «Новы сьвет» (Віцебск), якая мае вытворчае заданьне ў 355 га, засеяла толькі 33 проц., у тым ліку па гародных—на 20 проц. Гомельскі сельгаскамбінат, маючы вытворчае заданьне ў 978 га, засеяў 61 проц. усёй плошчы, а па гораду —37,7 проц.

Асноўнай «прычынай», за якую імкнуцца ўчапіцца дырэктары гаспадарак і кіраўнікі Белкаапсельгасаб'яднаньня—гэта недахват цягавай сілы. Але-ж у сапраўднасьці справа зусім у іншым. Па Белкаапсельгасаб'яднаньні ёсьць уласных 2.200 рабочых коняй, ёсьць значная колькасьць уласных трактараў, ёсьць усе магчымасьці для таго, каб мабілізаваць цягавую сілу прадпрыемстваў гарадоў і г. д.

Адсутнасьць штодзённага жывога аперацыйнага кіраўніцтва з боку Белкаапсельгасаб'яднаньня ходам сяўбы, адсутнасьць барацьбы за ажыцьцяўленьне шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна, непаваротлівасьць і бюракратычныя адносіны да галоўнейшых зьвеньняў пасеўнай, як арганізацыя працы, цягавай сілы і г. д.—вось асноўныя прычыны ганебнага адставаньня сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.

Сам дырэктар Белкаапсельгасаб'яднаньня т. Арапутчык ня ведае сапраўднага становішча сяўбы ў гаспадарках.

Да гэтага часу весткі аб ходзе сяўбы даваліся толькі па 11 буйнейшым гарадох, а асобнымі гаспадаркамі ніхто ня цікавіўся. Працаўнікі Белкаапсельгасаб'яднаньня за буйнейшымі гаспадаркамі на час веснавой сяўбы не замацаваны. У рашаючыя дні пасеву і зараз амаль усе працаўнікі і спэцыялісты займаюцца канцылярщчынай. З 40 (прыблізна) працаўнікоў працуе на раёне толькі 5.

Загадчык сэктару кадраў і арганізацыі працы т. **Гарадзецкі** на пытаньне, як мабілізаваны людзі на пасеўную кампанію, адказаў: «Як-жа, у нас мабілізаваны ня толькі нашы людзі, але з іншых сэктароў Белкаапсаюзу. Бачыш, усе сталы заняты... Рыхтуюць весткі».

У рэзультаце адсутнасьці работы па ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі і ўраду аб арганізацыі працы, укараненьні зьдзельшчыны, у большасьці гаспадарак усе работа праводзіцца падзённа. Брыгады ня створаны, а там, дзе яны ёсьць, ня маюць поўных вытворчых заданьняў. Напрыклад, у саўгасе «Вольная праца» работа працякае самацёкам.

Адказны працаўнік т. **Гарадзецкі** такі правал у арганізацыі працы тлумачыць так: «Няма спэцыялёста па нармаваньні працы і таму фактычна мы гэтым ня кіруем».

Ганебны правал раньніх тэрміноў сяўбы здавалася-б павінен быў узварушыць кіраўніцтва Белкаапсельгасаб'яднаньня і на-ходу перабудавацца. Але тут усё «добра». Поўная ўпэўненасьць, што усё, што ад іх залежыла —зроблена. І зрыў сяўбы тлумачыцца выключна аб'ектыўнымі прычынамі.

Пасьля пасеўнай хутка надыйдзе ўборачная кампанія, але падрыхтоўка новых спэцыялістаў і перападрыхтоўка старых трактарыстаў і машынаведаў не праводзіцца. Улік работы трактарнага парку адсутнічае. Ёсьць гаспадаркі, дзе трактары стаяць толькі таму, што на іх няма каму працаваць. Кепскі рамонт трактараў і адсутнасьць кваліфікаваных трактарыстаў прыводзіць да частых паломак і прастояў. Якасьць работы трактараў вельмі нізкая.

Так працаваць далей нельга. Белкаапсаюз павінен тэрмінова заняцца работай дырэкцыі Сельгасаб'яднаньня і дабіцца рашаючага пералому ў сяўбе прыгарадных гаспадарак.

Б.

ЗВОДКА БЕЛКААПСЕЛЬГАСАБ'ЯДНАНЬНЯ

аб ходзе сяўбы ў прыгарадных гаспадарках БССР на 5 чэрвеня 1932 г.

ГАРАДЫ	Гародн. культуры: Плян	Засеяна	Проц. выканан.	Паляв. культуры: Плян	Засеяна	Проц. выканан.
Менск	1173	702,6	60	1448	1154	80
Віцебск	1066	344,35	32,3	2020	1122,8	55,5
Гомель	783	415,1	53,0	1688	1195	70,0
Магілеў	627	319,8	51,0	1708	1192,7	70,0
Варысаў	438,5	167,2	37,0	565	583,5	103,0
Бабруйск	777	456,7	58,0	1381	990	71,6
Рэчыца	329	158,1	48,0	1383	635	53,7
Полацак	260	96,1	37,0	801	395	49,3
Мазыр	219	197,5	90,5	626	445,3	71,0
Ворша	538	381,1	71,5	1138	1078,6	95,0
Шклоў	123	44,5	36,5	431	121,0	28,0
Жлобін	205	148,5	72,6	290	221	76
УСЯГО	6538	3430	52,5	13276	9134	69

УВАГА: з райсаюзамі процант выканаўня па гародных культурах—57,3, па палявых—75,4.

СЁНЬНЯ—ЗЬЛЁТ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП МЭТАЛЯПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

На ўсіх прадпрыемствах мэталяапрацоўнай прамысловасьці БССР праведзена значная падрыхтоўка да Ўсебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп, які сёньня склікаецца.

Падрыхтоўка прайшла пад знакам **аўладаньня тэхнікай, асваеньня новых вытворчасьцяй, фарсаваньня выканаўня заказаў чорнай мэталюргіі і ўключэньня ў сталінскі паход па паляпшэньні рабочага снабжэньня.**

Дэпутацкая група **заводу імя Варашылава** ўзяла пад свой нагляд будаўніцтва новага варштату тыпу «Вэб». Брыгада з членаў гарсавету распрацоўвае сьпіс прадметаў, якія можна вырабляць з адкідаў і намячае неабходную для гэтага колькасьць рабочых і інструмантаў.

На **заводзе «Ударнік»** выраблена з адкідаў, у якасьці пробы, пекалькі падкоў. Намечана паладзіць выпуск раду прадметаў хатняга інвэнтару.

Дэпутацкая група **заводу «Камунар»** узяла шэфства над скансструяваньнем першага ў СССР бульбянога камбайну і паставіла пытаньне аб вылучэньні двух інструктароў для вырабу гэтай машыны. Брыгады абсьледвалі, як скарыстоўваецца імпартнае абсталяваньне на заводзе імя Молатава і праверылі заяўкі Белмэталпаб'яднаньня на імпарт машын.

Савецкі актыў **заводу імя Ланцуцкага** (Гомель) зьвярнуўся да дэпутацкіх груп Марыўпальскага заводу імя Фрунзэ, Днепрапятроўскага, Ніжня-Тагільскага і Варашылаўскага мэталюргічных заводаў з заклікам — дапамагчы ў хутчэйшым выкананьні заказаў заводу імя Ланцуцкага.

Дапамога дэпутацкіх груп мэталюргічных заводаў адыграла вялізарную ролю ў выкананьні прамфінпляну заводу імя Ланцуцкага, ва ўзмацненьні паравознага і вагоннага парку.

Дэпутаты **заводу «Камінтэрн»** (Гомель) узялі шэфства над выкананьнем заказаў для віцебскай лямпавай фабрыкі, якое зацягвалася. Група дабілася перадачы заказу ўдарнай брыгадзе, якая яго выканала да тэрміну. Пры ўдзеле дэпутатаў заводу выраблена 10 варштатаў для лямпавай і тэкстыльнай фабрык, што аслабяне іх ад увозу машын з-за мяжы.

Дэпутацкая група **Гомсельмашу** наладзіла цесную сувязь з савецкім актывам Ніжагародзкага заводу імя Кагановіча. Гомсельмаш адчувае недахват у нажох да сіласарэзак і сячкарань. Брыгада, накіраваная ў Ніжні Ноўгарад, дабілася адгрузкі заводу 2.100 нажоў.

Вялікая работа па асваеньні новай тэхнікі і па рацыяналізацыі вытворчасьці праведзена на віцебскіх прадпрыемствах—**«Чырвоным мэталісьце і акулярнай фабрыцы.**

Зьлёт дэпутацкіх груп, побач з абгаварэньнем важнейшых пытаньняў аўладаньня перадавой тэхнікай і заваяваньня тэхнічна-эканамічнай тэхнікай, павінен усебакова абмяркаваць пытаньне аб арганізацыі уцільзхаў на прадпрыемствах мэталяапрацоўчай прамысловасьці, аб скарыстаньні адкідаў для вырабу прадметаў шырокага спажываньня.

Д. Чудноўскі

Асноўныя праблемы электрыфікацыі БССР

Да 1-га Усебеларускага энэргазьезду

XVII Усесаюзная партканфэрэнцыя, як адну з асноўных умоў выкананьня вялізарных задач другой пяцігодкі, высунула праблему карэннай тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, узьняцьця ўсіх галін яе на вышэйшы тэхнічны ўзровень.

Канфэрэнцыя ў сваёй рэзалюцыі запісала: «Без правядзеньня тэхнічнай рэканструкцыі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, без падвядзеньня пад іх навейшай машыннай тэхнікі — нельга забясьпечыць бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, якіх патрабуе ажыцьцяўленьне асноўных задач другой пяцігодкі».

Гэта баявая дырэктыва партыі выцякае з усёй палітыкі яе, накіраванай на ўсямернае разгортваньне вытворчых сіл Савецкага Саюзу.

Значэньне тэхнічнай рэканструкцыі

Ленін ця раз падкрэсьліваў, што пабудова сацыялістычнага грамадзтва дапачае, перш за ўсё, гігантскае разьвіцьцё прадукцыйных сіл.

«Прадукцыйнасьць працы гэта ў апошнім рахунку самае важнае, самае галоўнае для новага грамадзкага ладу. Капіталізм стварыў прадукцыйнасьць працы нячуваную пры прыгонніцтве, капіталізм можа быць канчаткова пераможаны і будзе канчаткова пераможан тым, што сацыялізм створыць новую, значна больш высокую прадукцыйнасьць працы». (Ленін).

«Мэханізацыя працэсаў працы зьяўляецца для нас рашаючай сілай, без якой немагчыма вытрымаць ні нашых тэмпаў, ні нашых маштабаў». (Сталін).

Гэтыя словы т. т. Леніна і Сталіна лепш за ўсё характарызуюць тое значэньне, якое надае партыя росту эфэктыўнасьці працы, на аснове навейшых дасягненьняў тэхнікі, у справе канчатковай перамогі сацыялізму.

Што-ж зьяўляецца асновай тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі Саюзу? Ня прыходзіцца шмат даказваць, што трыма галоўнымі элемэнтамі тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі зьяўляюцца **мэханізацыя, хэмізацыя і электрыфікацыя.** Аднак, асабліва выключную ролю ў тэхнічнай рэканструкцыі адыгрывае электрыфікацыя, як «венец дасягненьняў сучаснай тэхнікі ў галіне мэханізацыі працы» (плян ГОЭЛРО).

Тав. Ленін падкрэсьліваў, што адзінай матар'яльнай падставай сацыялізму можа быць буйная машынная прамысловасьць, здольная рэарганізаваць і зямляробства. Ленін жорстка асуджаў тых, хто не разумеў значэньня электрыфікацыі, як сынтэзу ўсіх дасягненьняў навукі і тэхнікі, тых, хто процістаўляў электрыфікацыі іншыя элемэнты сацыялістычнага будаўніцтва.

Ён розка выступаў супроць тых, хто не разумеў вядучага лёзунгу «**камунізм ёсьць савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны**», які вызначае, а не выключае іншыя элемэнты сацыялістычнай, тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі

Было-б зусім направільным зводзіць задачы электрыфікацыі выключна да будаўніцтва электрастанцый. Такая пастаноўка пытаньня прывяла-б да выпустошваньня ідэй электрыфікацыі ўсіх галін народнай гаспадаркі, як прадпасылкі пераводу іх на вышэйшы тэхнічны ўзровень.

Тав. Сталін на плепуме ЦК у лістападзе 1928 году, спыніўшыся на вялікім прынцыповым і палітычным значэньні пастаўленага Леніным пытаньня аб электрыфікацыі ўсіх галін народнай гаспадаркі, гаварыў: «як бачыце, над электрыфікацыяй краіны Ленін разумее не ізаляваную пабудову пазасобных электрастанцый, а паступовы пераход гаспадаркі краіны, у тым ліку і зямляробства, на новую тэхнічную базу, на тэхнічную базу сучаснай буйнай вытворчасьці, зьвязанай так ці інакш, проста або ўкосна, са справай электрыфікацыі».

Вось чаму пустой і шкодная балбатнёй зьяўляецца супроцьстаўленьне электрыфікацыі іншым элемэнтам тэхнічнай рэканструкцыі.

Гаворачы аб шляхох тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі Саюзу ў другой пяцігодцы, неабходна падкрэсьліць, што **сапраўднае разьвіцьцё прадукцыйных сіл, на аснове асваеньня самых новых дасягненьняў тэхнікі і навукі, можа мець месца толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, ва ўмовах будаўніцтва сацыялізму.** Можна прывесьці шмат прыкладаў, якія даволі яскрава характарызуюць той факт, што капіталізм затрымлівае разьвіцьцё прадукцыйных сіл, што ён ня здольны поўнасьцю асвоіць дасягненьні навукі і тэхнікі. «Тэхніка капіталізму, — пісаў Ленін яшчэ ў 1913 годзе, — з кожным годам перарастае тыя грамадзкія ўмовы, якія асуджаюць працоўных на наёмнае рабства».

Капіталістычны лад імкнецца затрымаць разьвіцьцё тых унутраных сіл, якія вядуць яго да няўхільнай пагібелі, затрымаць тэхнічны прагрэс. Пасобныя «вучоныя» — прадстаўнікі капіталістычнага сьвету — прабуюць утаіць, прыкрыць той рэгрэс, які пазглядаецца ў капіталістычнай тэхніцы.

Амэрыканскі інжынэр Роберт Сіблей, які набываў на Днепрабудзе, выпусьціў нядаўна кніжку «Амэрыканскі адказ на расійскі выклік».

Камэнтуючы лёзунг Леніна, ён процістаўляе ўзровень электрыфікацыі ў Каліфорніі і Савецкім Саюзе і прыходзіць да выводу аб тым, што Савецкі Саюз яшчэ далёка адстае ад Амэрыкі, што ў Каліфорніі электрыфікацыя ўжо дала тыя дадатныя вынікі, якія абяцаў Ленін пры сацыялізьме і што таму Каліфорнія павінна служыць прыкладам для ўсіх краін і ў тым ліку для СССР. Ён прапануе перафразіраваць лёзунг Леніна аб электрыфікацыі наступным чынам: «Добрая воля плюс электрыфікацыя азначае мір народаў».

Гэты прапаведнік капіталістычнага «прагрэсу» сьвядома не заўважвае таго глыбейшага крызісу, які перажывае электрыфікацыя побач з іншымі галінамі народнай гаспадаркі ва ўсіх, без выключэньня, капіталістычных краінах.

Ён не заўважвае таго, што амэрыканскія тэхнічныя часопісі вядуць жорсткую кампанію супроць навейшых дасягненьняў у галіне энэргабудаўніцтва. Вось што піша адна амэрыканская часопісь аб праекце будаўніцтва новых буйных гідра-электрастанцый у ПАЗШ, у басэйне р. Калумбія: «Гэты праект зьяўляецца сьмехатворным і несваячасовым. Пры нармальных умовах мы разглядалі-б яго, як бяскрыўдную прапаганду, але зараз у ім ёсьць элемэнты рэальнай небясьпекі, бо ён заснаваны на зусім іншым прадпасылцы, нібы ёсьць і будзе ў будучым вялікі попыт на энэргію з боку хэмічнай і электратэрмічнай прамысловасьці, тады як і бяз гэтага няма куды дзець прадукты гэтых галін прамысловасьці».

«Вучоны» апалёгет капіталізму не заўважвае таго, што колькасьць гадзін скарыстаньня электрастанцый (адзін з асноўных паказальнікаў эфэктыўнасьці работы энэргагаспадаркі) у ПАЗШ зьнізілася з 3.100 гадзін у 1929 г. да 2.500 гадзін у 1931 г.

Для таго, каб яскрава ахарактарызаваць падзенне эфэктыўнасьці скарыстаньня энэргагаспадаркі ў капіталістычных краінах, досыць адзначыць, што 1-ая раённая Беларуская Электрастанцыя імя Сталіна мае каэфіцыэнт скарыстаньня 6,5 тыс. гадзін.

Усе гэтыя факты лішні раз пацьвярджаюць, што капіталістычны лад ня здольны забясьпечыць прагрэс грамадзтва, ня здольны разьвіваць тэхніку, як адзін з асноўных элемэнтаў росту прадукцыйнасьці працы, што капіталістычны лад няўхільна вядзе да разрыву паміж разьвіцьцём прадукцыйных сіл і вытворчых адносін. Гэта зьяўляецца адзэй з асноўных прычын намінучай пагібелі капіталістычнай сыстэмы.

Вынікі пляну ГОЭЛРО

На фоне заняпаду электратэхнікі ў капіталістычных краінах асабліва яскрава вызначаюцца тыя вялізарныя посьпехі, якіх дасягнуў Савецкі Саюз на працягу апошніх год, тыя вялізарныя перспэктывы, якія вызначаны партыяй на другую пяцігодку.

11 год назад, пад кіраўніцтвам Леніна, быў складзен плян ГОЭЛРО. Ён намячаў шлях вывядзеньня народнай гаспадаркі Савецкага Саюзу са становішча разбуроньня, шлях складаньня тэхнічных прадпасылак для пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

За гэтыя 10 год мы пабудавалі дзесяткі буйнейшых электрастанцый, сотні гігантскіх прадпрыемстваў. Для таго, каб меркаваць аб выкананьні намі праектаваньняў ГОЭЛРО, досыць сказаць, што калі плян ГОЭЛРО вызначаў будаўніцтва 1.750 тыс. клвт. на працягу 10 год, дык у адным толькі 1932 г. мы ўводзім у строй электрастанцый ў 1.500 тыс. клвт., г. зн., мы за адзін год выконваем дзесяцігадовае намячэньне ГОЭЛРО.

Для характарыстыкі маштабаў электрыфікацыі СССР у другім пяцігодзьдзі досыць адзначыць, што на працягу другой пяцігодкі павінна быць праведзена электрабудаўніцтва магутнасьцю ў разьмеры 22-25 млн. клвт., што выпрацоўка электраэнэргіі да 1937 году павінна скласьці ня менш 100 млрд. клвт.-гадзін.

Яркай ілюстрацыяй таго якаснага ўзроўню, якога дасягнуў Савецкі Саюз у галіне электрыфікацыі, зьяўляецца параўнаньне разьмераў будаўніцтва электрастанцый у першым і другім пяцігодзьдзі.

Калі за першую пяцігодку мы асвоілі будаўніцтва такіх электрастанцый, як Волхаўская, Днепрабуд, Калашырская, «Рыштрэс» і інш., дык другое пяцігодзьдзе будзе праходзіць пад знакам будаўніцтва гігантскіх Волскіх электрастанцый, ажыцьцяўленьня Ангара-Енісейскай праблемы і інш. Гэта будаўніцтва ў шмат дзесяткаў раз перавышае маштабы першай пяцігодкі.

БССР, якая ў часы царызму зьяўлялася сапраўды жабрацкай, дробна аграрнай краінай, якая ня мела ні прамысловасьці, ні энэргетычнай гаспадаркі, дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі, дабілася гігантскіх посьпехаў у індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Валавая прадукцыя прамысловасьці, якая, паводле пляну, павінна была ў канцы першай пяцігодкі дасягнуць 981 млн. руб., у 1932 г. павялічылася да 1.100 млн. руб.

Да канца 1932 г. у БССР будзе налічвацца да 100 МТС, нагутнасьцю ў 70 тыс. конскіх сіл.

Гэтыя гігантскія посьпехі абумоўліваюць вялізарны ўздым матар яльнага і культурнага дабрабыту працоўных мас БССР.

Энэргагаспадарка БССР

Значна ўзрасла і энэргетычная база Беларусі. Калі яшчэ ў 1926-27 г. уся энэргагаспадарка БССР складала магутнасьць да 15 тыс. клвт., дык у 1932 г. мы маем 64 тыс. клвт. Няўхіль

На гарадзкіх канфэрэнцыях группарторгаў

„Карэнная і рашаючая задача кожнай ячэйкі, кожнага парткому—ахапіць палітычным уплывам і бальшавіцкай палітычнай узьдзейнасьцю ўсіх рабочых данага прадпрыемства, цэху, зьвяна“ (Л. М. Кагановіч)

За глыбокі зьмест работы нізавога партыйнага зьвяна

Пераходны сьцяг Менгаркому КП(б)Б за ўзорную пастаноўку работы атрымала партыйная група брыгады стругалёў заводу „Бальшавік“

Закончыла свае работы Менская гарадзкая канфэрэнцыя группартарганізатараў, у якой бралі ўдзел звыш 130 делегатаў.

З дакладам аб агляде партыйна-масавай работы і далейшых задачах па ўзмацненьні нізавога партыйнага зьвяна па прадпрыемствах выступіў сакратар гаркому КП(б)Б тав. Шпэктараў.

Тав. ЮНЦЕВІЧ — партор., пасажырскага цэху заводу «Полымя Рэвалюцыі»

— Тып задачы, якія стаяць перад намі ў сувязі са сканчэньнем заключнага году пяцігодкі і падрыхтоўкай да другой пяцігодкі, вымагаюць завяршэньня і ўдасканаленьня перабудовы партыйнай і масавай работы ў адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б), прынятай у сакавіку 1931 году і адпаведнымі дырэктывамі ЦК КП(б)Б. Трэба памятаць, што перабудова партыйна-масавай работы па-новаму, канцэнтрацыя яе ў нізавых зьвеньнях вытворчасьці, у партыйных групах не самамэта, а асноўная ўмова пасьпяховага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну на аснове выкананьня 6-ці сталінскіх умоў.

За першы квартал бягучага году прадпрыемствы Менску выканалі свой прамфінплян на 97 проц., прычым, калі ў студзені вытворчыя заданьні прадпрыемстваў былі выкананы ў сярэднім на 82 проц., у лютым — на 90 проц., дык у сакавіку мы мелі ўжо 100 з лішкам процантаў. Гэта тлумачыцца тым, што значная частка вытворчых партыйных арганізацый толькі ў канцы кварталу як належыць разгарнулі партыйна-масавую работу, пасапраўднаму ўзяліся за рэалізацыю ўказаньняў тав. Сталіна.

Нельга прайсьці міма таго, што пасьля сканчэньня першага кварталу рад партыйных арганізацый супакоіліся на дасягнутых посьпехах і зноў вымушылі ўвагу да разгортваньня партыйна-масавай работы. У выніку красавік даў поўнае зьніжэньне вытворчых паказальнікаў.

З гэтай скачкаватасьцю трэба безадкладна пакончыць. Вопыт усёй нашай работы на ажыцьцяўленьні сталінскіх умоў паказаў, што посьпехі ў выкананьні прамфінпляну могуць быць забясьпечаны толькі тады, калі кожнае зьвяно вытворчага трыкутніка будзе добра ўяўляць свае задачы, ня будзе пэўтарыць работу другога. Бязумоўна, што ў гэтым напрамку ня трэба дапускаць водамеўнага падыходу. Партыйная ячэйка і партыйная група павінны ведаць аб тым, што іх задача —кожны крок сваёй работы падпарадкаваць ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі, выхаваньню камуністаў, забясьпячэньню авангардной ролі іх па вытворчасьці.

Кожнае нізавое зьвяно партарганізацыі павінна ў цэнтр сваёй увагі паставіць разгортваньне арганізатарскай масава-палітычнай работы як унутры арганізацыі, так і сярод беспартыйных мас, мабілізуючы іх на ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна, на пасьпяховае выкананьне прамфінпляну. Трэба рашуча пакончыць з шкодным і шкоднымі настроямі, што разгортваньне партыйна-масавай работы, выхаваньне камуністаў і беспартыйных мас — справа толькі культпрап. ячэйкі.

Партыйная група — цэнтр цяжару партыйна-масавай работы. Яна павінна стаць сапраўдным ініцыятарам ажыцьцяўленьня лёзунгу «працаваць і вучыць па-новаму», павінна забясьпечыць рэгулярнае правядзеньне ў брыгадзе зьменна-сустрэчнага пляніраваньня, вытворчых нарад і г. д. Адной з рашаючых умоў, якая забясьпечвае добрую пастаноўку работы ў партыйнай групе, зьяўляецца яе цесная сувязь з шырокімі беспартыйнымі масамі. Як партыйная група ў цэлым, так і кожны камуніст у паасобку павінны ведаць усе запатрабаваньні беспартыйных рабочых у сваёй брыгадзе; кіраўнікі цэхавых ячэек і партыйных груп, на аснове глыбокага вывучэньня, павінны ведаць кожнага рабочага свайго вытворчага вучастку і ўсю работу партыйнага зьвяна будаваць па прынцыпе дыфэрэнцыяванага падыходу да паасобных груп рабочых.

Найбольш адсталым вучасткам у рабоце нізавых партыйных зьвеньняў па менскіх прадпрыемствах зьяўляецца **агітацыйная работа.** У нас амаль адсутнічаюць брыгадныя і цэхавыя агітатары. Задача як гарадзкога камітэту партыі, так і парткалектываў — неадкладна разгарнуць работу па стварэньні інстытуту агітатараў.

Рад кіраўнікоў цэхавых ячэек і партыйных груп не разумеюць яшчэ ў належнай ступені сутнасьці новых форм і мэтадаў работы. Ёсьць выпадкі, калі паасобныя партыйныя работнікі на прадпрыемствах сумняваюцца ў тым, ці патрэбен для партыйнай групы плян работы. А між тым ясна, што без каляндарнага пляну, які складаецца на аснове пляну цэхавай ячэйкі, группартарганізатару працаваць вельмі цяжка.

На некаторых прадпрыемствах яшчэ дыскусуюць аб тым, ці патрэбна ў партыйнай групе праводзіць сходы, забываючы аб тым, што партыйны сход зьяўляецца асноўным сродкам выхаваньня партыйных мас.

На радзе прадпрыемстваў («Камунар», «Кастрычнік», завод імя Молатава і інш.) кіраўнікі партарганізацый не разумеюць таго вялікага выхаваўчага значэньня, якое мае **партыйная нагрузка.** На гэтых прадпрыемствах ад 20 да 35 проц. камуністаў ня маюць ніякіх нагрузак.

Значная частка кандыдатаў партыі мае пратэрмінаваны кандыдацкі стаж. На заводзе «Кастрычнік» кандыдатаў са стажам звыш 6 месяцаў — 21, з аднагадовым стажам — 71, з двухгадовым—12 і з трохгадовым—2. Ня лепш стаіць справа на «Камунары», у парткалектыве цягі, на гуце, друкарні імя Сталіна і інш. Галоўнай прычынай такога становішча зьяўляецца тое, што парткалектывы і цэхавыя ячэйкі не вялі работы з кандыдатамі, не вывучалі кожнага з іх.

Неразуменьне сутнасьці новых форм і мэтадаў работы прыводзіць часта да таго, што ў паасобных вытворчых зьвеньнях цэхавыя ячэйкі і асабліва партыйныя групы падмяняюць сабой вытворчыя нарады, скажаюць лёзунг аб адзіначальні. На заводзе «Бальшавік» мелі месца выпадкі, калі партыйная група ў сваёй пастанове даручае брыгадзіру «штодзенна правяраць якасьць набіўкі і аб ўсіх недахопах паведамляць партыйную групу», або дае даручэньне «бракеру сваячасова даводзіць да ведама партарганізатара аб якасьці выпушчанай прадукцыі». Гэта яўнае парушэньне адзіначальня.

Істотным недахопам у рабоце менскіх вытворчых партарганізацый зьяўляецца тое, што яны амаль зусім не займаюцца пытаньнем паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых—разгортваньнем жылёвага будаўніцтва, грамадзкім харчаваньнем і г. д.—адной з асноўных умоў пасьпяховага выкананьня прамфінпляну.

Праўда, побач з гэтымі буйнымі недахопамі ў рабоце партыйных арганізацый менскіх прадпрыемстваў ёсьць і рад фактаў станоўчай работы. На тымжа заводзе «Бальшавік», на фабрыцы «Кастрычнік», на абутковай фабрыцы і інш. прадпрыемствах Менску ёсьць нямала такіх партыйных груп, якія сапраўды працуюць і кіруюць па-новаму, забясьпечваюць у сваіх брыгадах сыстэматычнае выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў. На

Группартарганізатар Менскай абутковай фабрыкі тав. Гэдут.

жаль, гэты вопыт перадавых партыйных груп ня стаў яшчэ здабыткам усіх нізавых партыйных зьвеньняў прадпрыемстваў. У нас вельмі мала аддаецца ўвагі разгортваньню паміж-брыгаднага спаборніцтва, арганізацыі ўзаемадапамогі паміж партыйнымі групамі і г. д.

Ставячы перад сабой задачу ўзмацніць нізавое партыйнае зьвяно, мы павінны зьвярнуць увагу на тое, каб дабіцца добрай работы цэхавых ячэек — непасрэдных кіраўнікоў партыйных груп. Трэба каб сакратары цэхавых партыйных ячэек аднудзьве гадзіны ў дзень аддавалі выключна партыйнай рабоце. Гэта дасьць магчымасьць цэхавым ячэйкам рэгулярна склікаць кіраўнікоў партыйных груп, належным чынам інструктаваць іх, правяраць іх работу, дапамагаць ім. Трэба рашуча не дапускаць цякучасьці партарганізатараў, што мае месца на нашых прадпрыемствах.

У нашых вытворчых партарганізацыях яшчэ вельмі мала ўвагі аддаецца справе правядзеньня **партыйных дзён.** Як правіла, да партыйных сходаў на прадпрыемстве ня рыхтуюцца. У рэзультаце — сходы посяць часамі казённы характар, ня ўвязваюць важнейшых палітычных пытаньняў з канкрэтнымі ўмовамі прадпрыемства. Кіраўнікі партарганізацый ня цікавяцца тым, каб зьмест партыйнага сходу адказаў на тыя пытаньні, якія ўзьнікаюць сярод рабочых мас прадпрыемстваў.

Узмацненьне нізавых партыйных зьвеньняў непарыўна зьвязана з работай па пырокім разгортваньні самакрытыкі і ўзмацненьні партыйнай дысцыпліны. Рад фактаў сьведчыць аб тым, што ў менскіх партарганізацыях ў гэтым напрамку зроблена далёка яшчэ ня ўсё. Часта мы выяўляем недахопы ў нашай рабоце са значным спазьненьнем. Трэба адзначыць, што ў апошні час у нашых вытворчых партарганізацыях на некалькі павялічыліся факты парушэньняў партдысцыпліны. Супроць гэтых парушэньняў мы павінны змагацца ня толькі шляхам партыйных спагнаньняў, але і ўзьняць цем палітычнага ўзроўню камуніста, разгортваньнем выхаваўчай работы.

***

Пасьля дакладу тав. Шпэктарава канфэрэнцыі аб сваёй рабоце рапартавалі перадавыя партыйныя групы заводаў «Бальшавік», абутковай фабрыкі, Менскага дэпо чыгункі, пякарні імя XIII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі і заводу імя Варашылава.

Першай рапартавала група брыгады стругалёў 1-га хромавага цэху заводу «Бальшавік». Партарганізатар гэтай групы тав. Гурэвіч азнаёміў канфэрэнцыю з тымі мэтадамі работы групы, якія забясьпечылі ў брыгадзе сыстэматычнае перавыкананьне прамфінпляну. Яшчэ з 1 верасьня 1931 г. па ініцыятыве партыйнай групы ў брыгадзе стругалёў праводзіцца сустрэчнае пляніраваньне, якое штодзенна абмяркоўваецца брыгадай на 10-ціхвілінных вытворчых нарадах.

Пераход брыгады на гаспадарчы разрахунак, ліквідацыя абязьлічкі і ўраўнілаўкі значна павысілі прадукцыйнасьць працы, забясьпечылі ў брыгадзе эканомію дапаможных матар'ялаў і паўфабрыкату.

Асноўная ўвага партыйнай групы была зьвернута на разгортваньне палітыка-выхаваўчай работы ў брыгадзе. Усе камуністы і звыш 60 проц. беспартыйных рабочых брыгады ахоплены партыйнай вучобай. На сходах партыйнай групы, дзе прысутнічаюць амаль усе рабочыя брыгады, брыгада знаёміцца з важнейшымі пастановамі партыі і ўраду. Правільная расстаноўка партыйных сіл і разьмеркаваньне абавязкаў, сыстэматычная праверка выкананьня кожным камуністам даручанай яму справы забясьпечылі ў брыгадзе сапраўды вядучую ролю членаў і кандыдатаў партыі. Калі ў першым квартале беспартыйныя рабочыя выконвалі свае вытворчыя заданьні ў сярэднім на 132 проц., дык камуністы — на 151 проц. За красавік месяц адпаведна 147 і 170.

Аналёгічныя формы і мэтады работы маюць месца і ў партыйнай групе трэцяй гаспадарча-разрахунковай брыгады імя Мопру на абутковай фабрыцы, у партыйнай групе кацельнага цэху Менскага дэпо, на пякарні імя XIII-цігодзьдзя Кастрычніка і на заводзе імя Варашылава. Т.т. Гедут (абутковая), Богін (дэпо чыгункі), Комараў (пякарня) і Батвінік (завод імя Варашылава) — кіраўнікі перадавых груп запэўнілі канфэрэнцыю, што на дасягнутых посьпехах яны ня спыняцца, што свой вопыт яны перададуць адсталым групам прадпрыемстваў.

Сярод іншых у спрэчках выступіў тав. **Гальперын** (завод «Камунар»). Характарызуючы становішча з перабудовай партыйна-масавай работы на сваім заводзе, т. **Гальперын** адзначыў, што на «Камунары» да перабудовы партработы падышлі фармальна: выбралі партарганізатараў, а бюро калектыву і цэхавай ячэйкі не забясьпечылі іх канкрэтным кіраўніцтвам, кіраўнікі партыйных груп ня ведалі сваіх абавязкаў. Вельмі мала дапамогі ў гэтым напрамку партыйная арганізацыя «Камунара» атрымала і ад гаркому партыі.

Пасьля спрэчак і рапартоў партгруп з прамовай выступіў заг. аргінструктарам гаркому тав. **Каждан**, які ахарактарызаваў работу нізавых партыйных зьвеньняў менскіх прадпрыемстваў. У заключэньне тав. Каждан агалосіў пастанову Менгаркому КП(б)Б:

«За бальшавіцкую работу па рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна, забясьпячэньне сапраўднай кіруючай ролі камуністаў на прадпрыемстве, пасьпяховае разгортваньне партыйна-масавай і выхаваўчай работы перадаць пераходны сьцяг гарыому КП(б)Б партыйнай групе брыгады стругалёў першага хромавага цэху заводу «Бальшавік».

Агалашэньне пастановы суправаджаецца гучнымі воплескамі канфэрэнцыі.

— Гэты сьцяг, — гаворыць тав. **Каждан**, — павінен быць для кожнага нізавога партыйнага зьвяна асноўным стымулам у барацьбе за перабудову партыйнай работы, за ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна, за пасьпяховае выкананьне прамфінпляну.

З адказам ад чырвонасьцяжнай партгрупы выступіў яе групорг тав. **Гурэвіч.**

— Атрымліваючы гэты сьцяг, наша партыйная група запэўняе канфэрэнцыю і ўсю партарганізацыю, што мы з яшчэ большай энэргіяй возьмемся за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, будзем моцна трымаць даную нам гаварову адзнаку.

Кіраўнік першай партгрупы заводу «Бальшавік» тав. Гурэвіч.

Канфэрэнцыя зацьвердзіла рэзалюцыю, якая дае разгорнутую праграму работы для вытворчых партарганізацый Менску.



Фабрыка «Уцільскура» пры гарсавеце арганізавалася ў першай палове 1930 г.

«Уцільскура» атрымлівае карысныя для механізаванай скуранай прамысловасьці адкіды, якія да гэтага часу не выкарыстоўваліся, і вырабляе зусім годны і моцны абутак.

У 1932 г. «Уцільскура» выпусьціць 586.100 пар абутку, з іх балетак — 57.400, дзіцячага абутку — 14.350 пар, рэшта — іншыя віды рабочага абутку. Прамфінплян 1931 году выканан на 115 проц., за першы квартал 1932 г. — на 112 проц. За ўдарную работу фабрыка прэміявана. Продукцыя разыходзіцца па ўсім Саюзе.

ПРА ІЛЬГОТЫ ПАСЕЎШЧЫКАМ КАНАПЕЛЬ

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

У адпаведнасьці з пастановай СНК СССР за 5 чэрвеня 1932 г. «Пра ільготы пасеўшчыкам канапель» Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Поўнасьцю вызваліць Любаньскі, Камарынскі, Нараўлянскі, Хойніцкі, Кармянскі і Брагінскі раёны ад кантрактацыі і загатоўкі збожжавых культур, пры абавязковым выкананьні пляну пасеву і здачы (продажу) прадукцыі канапель па кантрактацыйных дагаворах.

2. Ва ўсіх іншых раёнах абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты вызваляць ад кантрактацыі збожжазагатовак калгасы і паасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі пры засеве імі ня менш 5 проц. канапель да агульнай пасеўнай плошчы (азімай і яравой) і здачы (продажу) дзяржаве прадукцыі канапель па кантрактацыйных дагаворах.

3. Увесь ураджай плоскані, выбраны калгасьнікамі і адпаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі, не кантрактуецца, а паступае поўнасьцю ў іх непасрэднае распараджэньне, у сувязі з гэтым зьменьшць устаноўленыя кантрактацыйнымі дагаворамі абавязацельствы калгасаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па здачы валакна і насеньня канапель на 30 проц.

4. Прадаставіць калгасам, калгасьнікам і адпаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам пры выкананьні абавязацельстваў па здачы ўстаноўленай дзяржаўным планам колькасьці валакна і насеньня канапель поўную магчымасьць на погляд пасеўшчыкаў пераапрацаваць насеньне канапель і канапляную салому на дзяржаўных, кааперацыйных і саматужных прадпрыемствах, а таксама ў сяўбе, у гаспадарках.

5. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты ўстанавіць кантроль за прадастаўленьнем ільгот пасеўшчыкам канапель паводле гэтай пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР—М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Знаменнікага Савету БССР — С. КАНДЫБОВІЧ.

9 чэрвеня 1932 г.
г. Менск.

Адкрыўся другі пленум ЦС Асоавіяхіму БССР

8 чэрвеня распачаў сваю работу 2-гі пашыраны пленум ЦС Асоавіяхіму БССР.

У парадку дня пленуму стаіць пытаньне аб задачах таварыства ОАХ БССР у сувязі з пастановамі ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і III-га пленуму ЦС ОАХ СССР.

Увечары 8 чэрвеня пленум заслухаў даклад старшыні Асоавіяхіму БССР **т. Галадзеда.**

Пленум віталі прадстаўнікі ад асоавіяхімаўскіх арганізацый заводу «Камунар», кав. дывізіі, ад вучэбных пунктаў ОАХ і інш.

Пленум прыняў пастанову, у якой далучыўся да патрабаваньняў рабочых прадпрыемстваў Савецкага Саюзу аб выпуску пазыкі «чацьвертага, заключнага году пяцігодкі».

Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б, РВС БВА і ЦС Асоавіяхіму СССР.

***

9 чэрвеня на раніпнім пасяджэньні пленум заслухаў даклад нам. старшыні ЦС Асоавіяхіму БССР т. **Дрыгіна.** Па абодвух дакладах разгарнуліся спрэчкі.

Тутнай збройнай тэхнічнага пераўзбраеньня прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Сацыялістычны рахунак энэргагаспадарцы

Адзначаючы ролю электрыфікацыі ў разьвіцьці народнай гаспадаркі БССР, неабходна коратка спыніцца на тым рахунку, які прад'яўляюць да энэргагаспадаркі сацыялістычная прамысловасьць і земляробства.

Народная гаспадарка БССР у другім пяцігодзьдзі будзе разьвівацца на аснове ўзмацненьня вядучай ролі прамысловасьці, на базе выразнай спэцыялізацыі БССР у гаспадарчым комплексе Усяго Саюзу.

Адсюль найбольш інтэнсіўны размах атрымаюць вядучыя галіны прамысловасьці БССР галіны прамысловасьці, якія базуюцца на мясцовым сырцы: хэмічная, тарфяная, будматар'ялаў, ільна-тэкстыльная, папяровая, харчовая і інш.

Задача завяршэньня тэхнічнай рэканструкцыі гэтых галін прамысловасьці патрабуе стварэньня магутнай электрычнай і цеплавой базы. Таму важнейшымі задачамі зьявяцца шырокае ўкараненьне індывідуальнага электрапрыводу ў прамысловасьць з электрычным рэгуляваньнем хуткасьці і аўтаматызацыяй работы машын; укараненьне электразваркі, ужываньне ў прамысловасьці розных электранагрэвальных прыладаў і інш.

Ставячы перад сабой задачу поўнай электрыфікацыі прадпрыемстваў буйнай дзяржаўнай прамысловасьці і максымальнай электрыфікацыі мясцовай саматужнай прамысловасьці, мы павінны забясьпечыць іх вялізарнай масай энэргі. Паводле арыентовачных падлікаў, агульная патрэба прамысловасьці ў электраэнэргіі да 1937 г. складае ня менш 1,5 млрд. клвт.-гадзін, з іх па тарфяной прамысловасьці — да 200 млн., па хэмічнай — да 150 млн., на тэкстыльнай — да 280 млн., па металяапрацоўчай — да 100 млн. клвт.-гадзін.

Побач з гэтай вялізарнай колькасьцю электраэнэргіі прамысловасьць патрабуе вялікай колькасьці цяпла для тэхналёгічных патрэб. Стварэньне тэхнічна ўдасканаленай энэргагаспадаркі дае магчымасьць паладзіць ня толькі цэнтралізаванае снабжэньне прамысловасьці электраэнэргіяй, але таксама цяплом ад раённых цёпла-электрацэнтраляй.

Бязумоўна, што асноўнай рухаючай сілай у сельскай гаспадарцы застаецца трактар, але было-б шкодным прапіставіць трактар, як асноўны мэханізм у сельскай гаспадарцы, электрыфікацыі, паступовае ўкараненьне якой ва ўсе працэсы сельскай гаспадаркі забясьпечвае завяршэньне яе тэхнічнай рэканструкцыі.

Сельская гаспадарка БССР, якая спэцыялізуецца на ільнаканоплях, малочнай жывёлагадоўлі і сьвінаводзтве, патрабуе значна больш інтэнсіўнага ўкараненьня электрычнасьці ў сельскую гаспадарку, чым іншыя раёны Саюзу.

Аб вялізарнай эфэктыўнасьці працэсаў электрыфікацыі вытворчасьці калгасаў і саўгасаў гаварыць ня прыходзіцца. На сёпешні дзень электрыфікацыя пераважнай большасьці ўсіх працэсаў, зьвязаных з жывёлагадоўляй, з першапачатковай пераапрацоўкай прадуктаў апошняй, з апрацоўкай тэхнічных культур тэхнічна і эканамічна асвоена. Электрычнасьць можа быць шырока ўжыта як у галіне падрыхтоўкі кармоў і дастаўкі, так і ў галіне даеньня, выпрацоўкі масла, стэралізацыі малака і інш. Адзін з работнікаў па электрыфікацыі с.-г. тав. **Шліхтэр** падлічыў, што ўвядзеньне электраэнэргіі ў саўгасах малакамасьлянага тросту па працягу двух год павінна даць эканоміі звыш 100 млн. руб., значна скараціць патрэбу ў людзкіх сілах для абслугоўваньня гаспадарак, значна павышае якасны ўзровень сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Паводле яго падлікаў, электрыфікацыя аднаго толькі працэсу даеньня дае эканоміі выдаткаў з 2,5 кап. да 1,5 кап. на адзін літр малака. Вялізарны эфэкт дае ўзьдзейнасьць электраэнэргіі на біялёгічныя працэсы разьвіцьця жывёлы і расьлін. На птушкавай фэрме пры Цімірязеўскай акадэміі праводзіліся вопыты ўзьдзейнасьці электраэнэргіі на курчат. Эфэкт перавысіў усе мяркаваньні. Курчаты, якія пасьля ўзьдзейнасьці ўльтра-фіялетавых праменьняў паказалі амаль на 100 грам большую вагу, чым курчаты, што атрымлівалі рыбны тлушч, пры чым затраты пры першым спосабе ў дзесяць раз менш, чым пры другім.

Укараненьне электрыфікацыі ў апрацоўку глебы зьяўляецца фактарам вялізарнага павышэньня ўраджайнасьці і скарачэньня тэрмінаў высьпяваньня расьлін.

Электраэнэргія займае вялікае месца ў кансэрвацыі пладу і гародніны, захоўваючы іх вітамінасьць. Вопыты паказалі, што трускаўкі, узятыя з градкі, зьмешчаныя ў шкляным слоіку і запячатаныя, пасьля апрацоўкі іх электрычнасьцю на працягу трох мінут, застаюцца ў зусім сьвежым выглядзе на працягу году.

Вось некалькі прыкладаў, якія кажуць аб надзвычай шматгранных шляхох электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. У першую чаргу мы павінны электрыфікаваць найбольш працаёмкія працэсы ў буйных сельска-гаспадарчых прадпрыемствах (саўгасах, калгасах, таварных фэрмах і МТС). Агульная патрэба сельскай гаспадаркі ў электраэнэргіі, паводле арыентовачных падлікаў, складае да 250-300 млн. клвт.-гадзін.

Дырэктыва XVII партыйнай канфэрэнцыі аб вялізарным уздыме матар'яльнага дабрабыту працоўных мас у другой пяцігодцы патрабуе разгортваньня самага шырокага жыльёвага камунальнага будаўніцтва, якое таксама павінна праводзіцца на аснове навейшых дасягненьняў навукі і тэхнікі. На працягу другой пяцігодкі мы ставім перад сабой задачу поўнай электрыфікацыі гарадзкіх і сельскіх паселішчаў, якія знаходзяцца ў раёне дзейнасьці электрастанцый; мы ставім задачу электрыфікацыі ў гэтых паселішчах працэсаў абагуледнага быту (сталоўкі, фабрыкі-кухні, ясьлі), усіх камунальных прадпрыемстваў (водаправод, каналізацыя і інш.).

Побач з гэтым, электрычнасьць павінна няўхільна ўкаранятца ў індывідуальны быт (пагравальныя прылады, электра-прасы, пліты і інш.). Агульная патрэба ў электраэнэргіі з боку камунальнай гаспадаркі арыентовачна вызначаецца ў 300 млн. клвт.-гадзін.

У галіне транспарту на працягу другой пяцігодкі мяркуецца правесьці рад мерапрыемстваў па электрыфікацыі чыгуначных вузлоў, пагрузачна-разгрузачных работ, аўтаматызацыі кіраўніцтва транспартнай сыстэмай і інш. У перспэктыве мяркуецца электрыфікаваць Беларуска-Бальтыцкую чыгунку і інш.

Вось у кароткіх рысах рахунак, які прад'яўляюць асноўныя галіны народнай гаспадаркі да энэргетыкі. З той характарыстыкі, якая была дана вышэй цяперашняму становішчу нашай энэргетычнай гаспадаркі, зусім ясна, што сучасны ўзровень ня ў стане пакрыць нават невялікую часткі гэтых патрэб. Адсюль выцякае актуальная задача — самым фэрсавым чынам будаваць новую магутную энэргетычную гаспадарку БССР, здольную поўнасьцю задаволіць усе запатрабаваньні.

Адзіная высокавольтная сетка

Асноўным прынцыпам электрабудаўніцтва ў другім пяцігодзьдзі зьяўляецца **стварэньне адзінай высокавольтнай сыстэмы,** заснаванай на скарыстаньні мясцовых энэргетычных рэсурсаў. Гэта сыстэма будуецца на прынцыпе кам бінаванай выпрацоўкі электра-цепла-энэргіі ў цеплаэлектрацэнтралях, гідраўлічных ветраных устаноўках і інш.

Толькі стварэньне адзінай высокавольтнай сыстэмы забясьпечвае найбольшую эфэктыўнасьць як будаўніцтва энэргагаспадаркі, так і яе работы.

10 буйных раённых электрастанцый

У другой пяцігодцы намечана будаўніцтва 10 буйных раённых электрастанцый, злучаных у адзіны высокавольтны ланцуг. Магутнасьць гэтых электрастанцый будзе складаць да 500 тыс. клвт.: Асінбуд — 80 тыс., Гомель — 96 тыс., Аболь — 60 тыс., Мазыр — 48 тыс., Быхаў — 96 тыс., Менск — 24 тыс., Барысаў—24 тыс., Бабруйск — 48 тыс., Віцебск — 24 тыс., Магілеў — 12 тыс. У дадатак да іх будзе будавацца рад станцый мясцовага значэньня з давядзеньнем іх агульнай магутнасьці да 40 тыс. клвт. Усе гэтыя станцыі павінны да 1937 г. выпрацоўваць 2,5 млрд. клвт.-гадзін. Адзіная ўсебеларуская высокавольтная энэргетычная сыстэма будзе на працягу другой пяцігодкі ўключана ў агульную сыстэму Усяго Саюзу праз Жаркаўскую і Бранскую станцыі Заходняй вобласьці.

Такая сыстэма дасьць магчымасьць зьвесьці да мінімуму неабходную рэзэрвовую магутнасьць. Досыць сказаць, што калі сёньня на Асінбудзе мы маем да 50 проц. рэзэрвовай магутнасьці, з прычыны таго, што ён ня злучан высокавольтнай сеткаю ні з адной электрастанцыяй, дык у 1937 г. агульная рэзэрвовая магутнасьць па БССР будзе складаць ня больш 10-12 проц.

Яшчэ адным яскравым паказальнікам высокага тэхнічнага ўзроўню энэргагаспадаркі БССР у другой пяцігодцы зьяўляецца тое, што 50 проц. устаноўленай магутнасьці будуць складаць цёплафікацыйныя агрэгаты.

Адзначаючы неабходнасьць стварэньня адзінай высокавольтнай сыстэмы ўнутры БССР, неабходна рашуча выступіць супроць думак аб тым, што ў БССР ня трэба будаваць буйныя раённыя электрастанцыі, а можна абмежавацца сеткай раздробненых энэргаўстановак.

Гэта зьяўляецца адрыжкай правапартыністычнай практыкі ў галіне электрыфікацыі, якая ў пэрыяд прыпчэпаўшчыны вызначалася ў электрыфікацыі хутароў, кулацкіх гаспадарак, у будаўніцтве дробных, разрозьненых электрастанцый.

Трэба даць рашучы адпор спробам падмяніць стварэньне адзінай сацыялістычнай энэргагаспадаркі, пляцам будаўніцтва карлікавых электрастанцый, выходзячы быццам з нейкіх спэцыфічных асаблівасьцяй БССР. Адначасова трэба ня менш рашуча ўдарыць па гігантаманіі, па імкненьні будаваць нашу энэргагаспадарку ў адрыве ад задач, якія стаяць перад ёй, як складанай часткай народнай гаспадаркі БССР.

Нашы рэсурсы

Што патрабуецца для забясьпячэньня гігантскіх тэмпаў электрабудаўніцтва ў другой пяцігодцы?

Перш за ўсё, патрэбна **адпаведная матар'яльная і тэхнічная база.** Энэргарэсурсы БССР нават у той стадыі вывучэньня, у якой яны знаходзяцца па сёпешні дзень, забясьпечваюць не абмежаванае разгортваньне энэргатычнай гаспадаркі. Асноўным рэсурсам зьяўляецца **торф.** Запасы яго арыентовачна складаюць 1,12 млрд. тон паветрана-сухога торфу, што дае магчымасьць давесьці выпрацоўку электраэнэргіі да 5 млн. клвт. — магутнасьць у 10 раз большая, чым у памянёных другой пяцігодкі.

Неабходна ў другім пяцігодзьдзі асвоіць найбольш мэханізаваны эфэктыўныя спосабы здабычы торфу, тым, каб максымальна патаніць кошт гэтага віду палівы, бо ад яго залежыць сабекошт электраэнэргіі на электрастанцыях БССР.

Гідраўлічныя рэсурсы БССР арыентовачна вызначаны ў 300 тыс. конскіх сіл па ўсіх рэках Рэспублікі. Аднак, яны ўключаны ў энэргетычны баланс другой пяцігодкі ў вельмі абмежаванай колькасьці, што тлумачыцца вялікай пізнікаю профілю тэрыторыі і адсутнасьцю вялікіх перападаў вады. Вызначанае будаўніцтва Обальскай і Кабэлякскай электрастанцый на 10-12 тыс. клвт. кожная патрабуе дакладнай прапрацоўкі і абгрунтаваньня.

На працягу другой пяцігодкі павінны быць шырока асвоены ветраныя рэсурсы БССР, якія складаюць прыблізна магутнасьць у 4 млн. клвт.

Побач з гэтым вялікую ўвагу трэба аддаць адшуканьню мясцовых будматар'ялаў для энэргабудаўніцтва.

Адна з важнейшых задач пабудовы энэргагаспадаркі — гэта стварэньне кадраў спэцыялістаў. Неабходна неадкладна прыступіць да разгортваньня сыстэмы вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў і да арганізацыі навукова-дасьледчых інстытутаў у галіне электрыфікацыі.

1-ы Ўсебеларускі энэргетычны зьезд, які сёньня адкрываецца, павінен прайсьці пад лёзунгам: карэннай тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, укараненьня ва ўсе галіны сацыялістычнай гаспадаркі электраэнэргіі і давядзеньня выпрацоўкі электраэнэргіі ў канцы другой пяцігодкі да 2,5 млрд. клвт.-гадзін. Гэтыя задачы намі будуць выкананы пад сталёвым кіраўніцтвам ленінскай партыі.

ПАТРАБУЕМ СПЫНІЦЬ ПАХОД АКУПАНТАЎ СУПРОЦЬ ТБШ І БЕЛАРУСКАГА ШКОЛЬНІЦТВА

Рэзалюцыя пратэсту рабочых чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава

Пячуваны разгул фашысцкага тэрору ў белапанскай Польшчы перайшоў усякія межы. Разьюшаная буржуазія накіроўвае сваю дзейнасьць па канчатковую ліквідацыю беларускага школьніцтва і адзінай культурна-асьветнай арганізацыі працоўных мас Зах. Беларусі—ТБШ (таварыства беларускай школы). Гэтымі днямі газэты прынесьлі весткі аб разгроме фашысцкай уладай Мірскай акруговай управы ТБШ, разгроме гуртку гэтага таварыства ў Слонімскім павеце, Вільні, аб закрыцьці настаўніцкай сэмінарыі ў Вільні і аб памерах закрыць апошнія беларускія гімназіі ў Вільні і Навагрудку.

Закрыцьцё апошніх беларускіх школ і гімназій зьяўляецца пралётленьнем новай хвалі жорсткага нацыянальнага ўціску з мэтай хутчэйшай палянізацыі беларускіх працоўных мас і іх фашызацыі. Акупанцкая белапольская ўлада ня можа пагадзіцца з тым фактам, што дзеці працоўных маюць магчымасьць вучыцца і быць сьвядомымі грамадзянамі, абаронцамі працоўных мас. Каб абмежаваць доступ у школы дзецям сялянскай беднаты і серадняку, белапанская ўлада скасоўвае пяжайшыя клясы, г. зн. шаглуха зачыняе дзьверы школы для дзяцей працоўнага сялянства, каб трымаць іх у цемры і мець з іх наслухмянае гарматнае мяса.

Ліквідацыя ТБШ і беларускага школьніцтва на Зах. Беларусі пры актыўнай дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстаў—Астроўскага, Луцкевіча і К° — гэта адзін з фактаў падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР. Каб ачысьціць тыл і падрыхтаваць плядарм для ваенных дзеяньняў супроць СССР, польскія імпэрыялісты душаць асабліва на Зах. Беларусі і Зах. Украіне рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух, ліквідуюць культурна-асьветныя арганізацыі і школьніцтва прыгнечаных народаў.

У той час, як у нас, у БССР, з кожным годам растуць сотні і тысячы ўсё новых і новых навучальных устаноў, у Зах. Беларусі, якая знаходзіцца пад ярмом белапольскіх акупантаў, ліквідуюцца апошнія школы як беларускія, так і літоўскія і яўрэйскія.

Мы, рабочыя чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава, у адказ крывавым фашысцкім катам, подлым пагромшчыкам нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўных мас Зах. Беларусі, яшчэ больш узмоцнім клясавую пільнасьць і будзем прыкладаць усе сілы па ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР, па будаўніцтва сацыялістычнай бясклясавай краіны.

Яшчэ шырэй разгорнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Канкрэтнымі самазабавязацельствамі паскорым датэрміновае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Патрабаваньнем выпуску новай пазыкі «Чацьвертага заключнага году пяцігодкі» і поўнай датэрміновай рэалізацыяй яе забясьпечым пабудову новых гігантаў індустрыі, узмацнім абароназдольнасьць нашай краіны.

Прэч крывавыя рукі ад нацыянальна-вызваленчага руху, ТБШ і беларускага школьніцтва!

Далоў акупантаў Зах. Беларусі!

Далоў крывавы фашысцкі тэрор!

Далоў здраднікаў і правакатараў працоўных мас—беларускіх нацыянал фашыстаў—Астроўскіх, Луцкевічаў і К°!

Дамагаемся аслабаненьня з турмаў лепшых барацьбітоў за вызваленьне Зах. Беларусі з-пад акупацыі **т. т. Таташкевіча, Валошына, Крынчыка, Гаўрыліка, Дварчаніна і ўсіх палітзьняволеных рабочых і сялян.**

Няхай жыве і магутнее нацыянальна-вызваленчы рух працоўных мас Зах. Беларусі!

Няхай жыве КПЗБ — правадыр нацыянальна-вызваленчага руху!

СЁНЬНЯ ПЕРШЫ ДЗЕНЬ МЕСЯЧНІКА ШТУРМУ БЕЗДАРОЖЖА

Разгортваньнем масавай работы забясьпечым шырокі ўдзел усіх працоўных у дарожным будаўніцтве

З першых дзён узяць ударныя тэмпы

Сёньня першы дзень месячніка штурму бездарожжа, першы дзень практычнай рэалізацыі закону ЦВК і СНК БССР аб працудзеле насельніцтва ў дарбудаўніцтве. Тысячы працоўных выйдуць на барацьбу са спадчынай старота ладу—на штурм бездарожжа.

Закон ЦВК і СНК БССР аб працудзеле насельніцтва ў дарбудаўніцтве сустрэчан у масах калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў са здавальненьнем. Гэта зусім зразумела. Добрыя дарогі маюць вялікае значэньне для эканамічнага і палітычнага разьвіцьця данай мясцовасьці.

Узмацненьне сувязі паміж пралетарскім горадам і вёскай, тысячы трактараў і аўтамашын, якія кінуты туды, разгортваньне савецкага і калгаснага гандлю і г. д.—усё гэта патрабуе добрай дарогі. Кожны разумее, якія вялікія страты прыносіць народнай гаспадарцы бездарожжа.

Барацьбу з бездарожжам нельга пасьпяхова весьці бяз удзелу шырокіх мас працоўных. Закон ЦВК і СНК гэта іменна падкрэсьлівае: **«Вялізарныя задачы ў галіне дарожнага будаўніцтва, ліквідацыя бездарожжа на вёсцы могуць быць вырашаны толькі пры ўмове масавага ўдзелу працоўных сельскіх мясцовасьцяй у дарожным будаўніцтве».**

Мясцовыя арганізацыі павінны шырока папулярызаваць закон у масах. Тыя весткі, якія паступаюць з месц, сьведчаць, што гэта работа разгорнута надзвычай слаба. Масавую работу трэба максымальна ўзмацніць. Важную ролю ў гэтым павінны адыграць культурна-асьветныя ўстановы (хаты-чытальні, школы, пардамы і г. д.).

Паводле закону калгасьнікі і аднаасобнікі прымяцваюцца на дарожныя работы тэрмінам на 6 дзён на працягу году. У гэтым годзе ўсе шэсьць дзён павінны быць скарыстаны ў часе месячніка. Задача заключаецца ў тым, каб на аснове сапраўднага разгортваньня масавай работы забясьпечыць 100 проц. выхад на работы ўсіх працаздольных. Дарожныя арганізацыі павінны правяць максымум распарадчасьці ў расстаноўцы рабочай сілы, у забесьпячэньні найбольшай эфэктыўнасьці скарыстаньня яе і г. д. Пытаньні культурна-бытовага абслугоўваньня, поўнай рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна набываюць выключна-важнае значэньне.

Трэба падкрэсьліць клясавы прынцып працудзелу ў дарбудаўніцтве. Непрацоўнае насельніцтва сельскіх мясцовасьцяй і кулацкая частка, паводле закону, прыцягваюцца ў абавязковым парадку на тэрмін у два разы больш, чым калгасьнікі і аднаасобнікі—беднякі і серадняк (на 12 дзён). «За неяўку для адбываньня працоўнага ўдзелу ў дарожным будаўніцтве накладаецца адміністрацыйным парадкам штраф... на кулакоў да 10-пі-разовага кошту працы, якая прыпадае на даную асобу за кожны дзень нявыхаду на работу, прычым у кулакоў забіраецца рабочая жывёла на той час, які яны павінны былі адпрацаваць» (з пастановы ЦВК і СНК БССР).

Праводзячы жорсткую лінію ў адносінах да кулацка-заможнай часткі, нельга дапускаць перагібаў у адносінах да калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў. Рашуча трэба зьнішчыць практыку падмены масава-растлумачальнай работы адміністраваньнем. Максымум увагі павінны накіраваць партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі на забесьпячэньне пасьпяховага разгортваньня месячніка з першых яго дзён. Спасылаўшы на тое, што яшчэ ідзе сяўба і таму нельга адрываць людзей, на маюць нічога агульнага з сапраўднасьцю. Ужо ёсьць маса калгасьнікаў, аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў, якія скончылі сяўбу, а рэшта гэтымі днямі заканчвае яе. Трэба так арганізаваць работу, каб, паставіўшы адной з асноўных задач—удзел у месячніку дарбудаўніцтва, ён у той-жа час не адбіўся і па ходзе сяўбы і іншых асноўных кампаній. Іменна ў гэтым бальшавіцкі характар работы, бальшавіцкае ўменьне ўвязваць важнейшыя пытаньні і рухаць іх наперад.

У радзе месц (Горацкі раён і г. д.) ужо зараз разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне месячніка. Партарганізацыі, прафсаюзы, гаспадарнікі павінны ўзяцца гэту ініцыятыву і ператварыць яе ў сапраўды масавы рух за поўнае і своячасовае выкананьне пляну.

У месячнік дарожнага будаўніцтва ўключаюцца ня толькі калгасьнікі і аднаасобнікі—беднякі і серадняк, ня толькі камсамол, фізкультурнікі, Аўтадор, але пачынаюць уключацца і рабочыя калектывы. Учора ў «Зьвязьдзе» была надрукавана пастанова агульнага сходу парткалектыву заводу «Камунар» аб адпрацоўцы на дарбудаўніцтве ня менш аднаго дня на працягу месячніка. Гэта ініцыятыва ўжо падхоплена ўсімі прадпрыемствамі гораду Менску. Учора пры гаркоме КП(б)Б адбылася гарадзкая нарада трыкутнікаў прадпрыемстваў. Нарада распрацавала рад практычных мерапрыемстваў па ўдзеле рабочых у месячніку, высунуўшы лёзунг: «ня менш аднаго выходнага дня аддаць дарожнаму будаўніцтву». Прыкладу менскіх прадпрыемстваў павінны пасьледаваць усе прадпрыемствы БССР.

Шырэй хвалю сацыялістычнага спаборніцтва! Па-ўдарнаму правядзем месячнік штурму бездарожжа!

Сэктар мэханізацыі Галоўдартрансу паказвае ўзоры... безгаспадарчасьці

Мэханізацыя на дарожным будаўніцтве адыгрывае важнейшую ролю ў выкананьні пляну. Выразная работа мэханізмаў зьяўляецца неабходнай умовай пасьпяховага разгортваньня работ. Трэба сказаць, што сэктар мэханізацыі Белдарбуду, які вірує работай па мэханізацыі, не падрыхтаваўся як належыць да дарожняга будаўніцтва, працуе па-старыцы, паказвае ўзоры непаваротлівасьці.

Сэктар мэханізацыі ня прыняў рашучых мер да своячасовага забесьпячэньня майстэрань запаснымі часткамі для рамонту мэханізмаў. На сёньняшні дзень каля 50 проц. трактараў стаяць у рамонце. Сэктар мэханізацыі несвоячасова спусьціў на базы пляны работ. Камплектаваньне складу прарабаў адбывалася насьпех. Пад вацскам Галоўдартрансу сэктар мэханізацыі прапанаваў базам выехаць на работу, абяцаўшы даслаць мэханізаваную колькасьць машын. Аднак, гэта абяцаньне засталося толькі на паперы. Да гэтага часу на базах недахват машын, прычым вялікія прастоі бываюць з тае прычыны, што рамонт іх надзвычай ніякай якасьці і што колькасьць грэдэраў не адпавядае колькасьці трактараў. Так, прараб 4, мае 4 грэдэры і толькі адзін трактар. Такім чынам, тры грэдэры заўсёды стаяць. Праўда, сэктар мэханізацыі прыслаў з Барысава трактар «Камунар», але як толькі яго зьнялі з рамы аказалася, што ён да работы ня годны.

У прараба 5 на працягу трох тыдняў прастойвалі 2 трактары, бо ў рамонце былі грэдэры. Такім чынам на адной базе—прастоі грэдэраў з прычыны недахвату трактараў, а на другім—наадварот. Усё гэта ёсьць вынік адсутнасьці апэрацыйнага кіраўніцтва, вынік безгаспадарчасьці сэктару мэханізацыі Белдарбуду.

Сэктар мэханізацыі не забясьпечыў прарабскія вучасткі аўтамашынамі для падвозкі гаручага. З прычыны-ж несвоячасовай падвозкі гаручага бываюць вялікія прастоі (у прараба 5 і інш.).

Нілкіх мер ня прымае сэктар мэханізацыі да ліквідацыі ўраўнілаўкі ў зарплаце работнікаў баз. Адноўкавую пэнсію атрымліваюць грэдэрысты, трактарысты і дзесятнікі.

Галоўдартранс павінен прымусіць сэктар мэханізацыі неадкладна перабудавацца і сапраўды па-апэрацыйнаму кіраваць тэй адказьнейшай работай, якая яму даручана.

Гаўрычэнка.

Дарарганізатары Горацкага раёну выклікаюць дубровенцаў на сацспаборніцтва

Бурны рост сацыялістычнай прамысловасьці і рэканструкцыя сельскай гаспадаркі СССР патрабуюць ад дарожных арганізацый БССР, ад усёй пралетарскай грамадзянасьці рашучых мер па ліквідацыі адставаньня дарожнай гаспадаркі. Пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне плянаў дарожных работ чацьвертага, заключнага году пяцігодкі магчыма пры штодзённым ужываньні сацыялістычных мэтадаў працы, пры ўзьняцьці на адпаведную вышыню і шырокім разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Мы дарарганізатары Горацкага раёну, разумеючы эканамічную каштоўнасьць добрых дарог, разумеючы задачы і мэты месячніка штурму бездарожжа, абвяшчаем сябе ўдарнікамі месячніка штурму і выклікаем на сацспаборніцтва дарарганізатараў Дубровенскага раёну па наступных паказальніках: поўнасьцю рэалізаваць на будаўніцтве 6 гістарычных умоў тав. Сталіна; на 100 проц. выканаць плян загатоўкі будматэрыялаў; поўнасьцю выканаць будаўнічую праграму 1932 году; на 100 проц. скарыстаць працадні па працудзеле насельніцтва ў дарбудаўніцтве, дабіцца поўнай эфэктыўнасьці работы шляхам павышэньня прадукцыйнасьці працы, ушчыльненьня рабочага дня і г. д.

Ад нарады дарарганізатараў

ПЕРАПЕЧКА.

Апартуніст Веранічкі супроць камсамольскіх суботнікаў

ЦК камсамолу Бел. вынес пастанову аб масавым удзеле ў месячніку дарожнага будаўніцтва камсамольскай арганізацыі БССР. Рад мясцовых камсамольскіх арганізацый ужо распрацавалі канкрэтныя пляны ўдзелу ў гэтым месячніку. Масавыя суботнікі камсамол выступае ў барацьбу з бездарожжам.

Начальнік 4-га дарбудзучастку тав. **Веранічкі** ў адказ на прапанову Віцебскага ГК ЛКСМБ распрацаваць сумесны плян адпрацоўкі 1.000 працадзён камсамольскай арганізацыяй, катэгарычна адмовіўся і прынцыпова выступіў супроць арганізацыі суботніка, тлумачаты тым, што на вучастку няма транспарту для перавозкі, што не хапае інструмантаў і тэхнэрэаналу. Тав. Веранічкі чамусьці лічыць, што «суботнік нічога карыснага ня дасьць, а толькі ўнясе блытаніну».

Лішне дказваць усю апартуністычную сутнасьць такіх разважаньняў і дзеяньняў начальніка вучастку.

В.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ЗА МЯЖОЙ

З голаду людзі падаюць на вуліцах

***

Мы тут толькі падалі пару выпадкаў тэй трагэдыі, якая разьгрываецца штодзенна ня толькі на акупаванай Зах. Беларусі, але і ва ўсёй Польшчы. У апошнія дні старонкі фашысцкай прэсы Польшчы перапоўнены паведамленьнямі аб масавых выпадках самагубстваў беспрацоўных, а таксама аб **паданьнях на вуліцах людзей ад зморанасьці і голаду.** Самагубствы наглядаюцца ня толькі ў горадзе, але і на вёсцы сярод сялян, якіх палітыка акупантаў давяла да руіны. Зразумела, што самагубствам канчаюць толькі асобы найбольш слабыя, выбітыя жыцьцём з калёй. Масы-ж працоўных пад кіраўніцтвам кампартыі вядуць не на жыцьцё, а на сьмерць барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры, за зьнішчэньне капіталістычнага ладу—ладу барбарскай эксплёатацыі, галечы і голаду.

Катаржны прысуд над украінскімі сялянамі ў Ковелі

ВАРШАВА, 7 (ТАСС) Акруговы суд у **Ковелі** вынес па днях прыгавор па справе **30 украінскіх сялян,** якія абвінавачваюцца ў арганізацыі камуністычнай дэманстрацыі 1-га мая 1932 году. У часе дэманстрацыі адбылася крывавая сутычка дэманстрантаў з паліцыяй, прычым 3 сялян былі забіты. Суд прыгаварыў аднаго селяніна **да 10 год, 5—да 8 год, 2-х—да 6 год, 2-х—да 5, 19—да аднаго-двух год і 5—да году катаржнай турмы.**

Урад Эрыё—урад далейшага наступленьня на жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы

ПАРЫЖ, 8. Пасьля агалашэньня ўрадавай дэклярацыі і прыняцьця рэзалюцыі аб вызваленьні з турмы кандэпутата **Рамэга,** выступілі з запытаньнямі ад імя камфракцыі т. т. **Дорыё і Пэры.**

Дорыё спыніўся на агульнай палітыцы францускага ўраду, а Пэры — на замежнай. Абодва рэзка крытыкавалі дэклярацыю. Торэс, які выступіў пасьля адказу Эрыё, зачытаў заяву ЦК кампартыі Францыі па матывах галасаваньня камфракцыі супроць габінэту Эрыё. У заяве падкрэсьліваецца: дэклярацыя новага ўраду і адказ Эрыё камуністычным дэпутатам паказваюць, што **новы ўрад радыкалаў будзе працягваць палітыку далейшага наступленьня на жыцьцёвы ўзровень рабочай клясы і шырокіх працоўных мас, палітыку далейшага шалёнага росту ўзбраеньняў.** Заява асобна адзначае ролю сацыялістычнай партыі ў правядзеньні гэтай палітыкі, ролю, якая вынікае з праграмы абароны капіталізму і сьвяшчэннага саюзу ўсіх буржуа. Заява падкрэсьлівае варожасьць сацыялістычнай партыі да Савецкага саюзу, на які яна не спыняе паклёпаў. Заява ганьбіць здрадніцкія паводзіны рэнэгатаў, якія сваім устрыманьнем ад галасаваньня, па сутнасьці далучыліся да буржуазнай большасьці новай палаты.

Галодны паход вэтэранаў вайны на Вашынгтон

ВАШЫНГТОН, 7. (ТАСС). Беспрацоўныя вэтэраны вайны працягваюць прыбываць у Вашынгтон, патрабуючы неадкладнай выплаты грашовых абавязацельстваў, выданых ім у выглядзе кампэнсацыі за ўдзел у вайне. У чаканьні надыходзячай дэманстрацыі ў Вашынгтоне мабілізаваны буйныя сілы паліцыі. **7000 вэтэранаў ужо прыбылі ў сталіцу, тысячы іншых знаходзяцца ў дарозе.** Некаторымі групамі беспрацоўных вэтэранаў кіруе рэвалюцыйная «Ліга рабочых былых вайсковых служачых». Другія-ж групы ўзначальваюцца рэакцыйнымі элемэнтамі. Начальнік паліцыі, імкнучыся падарвацьі ўплыў Лігі, заявіў, што «камуністы замышляюць напасьці на паліцыю».

Пасьля, аднак, ён вымушан быў прызнаць, што яго заява ні на чым не ўгрунтавана. Прадстаўнікі Лігі ўказваюць, што дрэнная якасьць харчовых рэсурсаў, якія разьмяркоўваюцца паліцыяй, выклікала захворваньні сярод многіх вэтэранаў. У Тэксаркане (штат Арканзас) 500 беспрацоўных вэтэранаў, якія дабіваліся бясплатнага праезду па чыгунцы ў Вашынгтон, прачалі чыгуначную ахову і селі ў адыходзіўшы таварны цягнік.

Амэрыка разбудоўвае паветраныя базы на Ціхім акіяне

НЮ-ЁРК, 7 (ТАСС). З моманту ўзьнікненьня далёка-ўсходняга канфлікту, **Злучаныя Штаты прынялі меры да ўмацаваньня сваіх паветраных баз на Ціхім акіяне.** «Чыкаго Дэйлі Ньюс» паведамляе з Ганалулы, што **ваенныя аэрадромы на Гавайскіх астравох значна пашырацюцца.** Паветраная база ў Кілеры будзе **пашырацца ў два разы.** Калі рэарганізацыя гэтай базы скончыцца, **яна зьявіцца першай у сьвеце па сваёй вялічыні** і магчымасьцях. Будзе ўдасканалена таксама паветраная база на востраве ў Гаваніцыра. Нядаўна морскія судны ПАЗШ пачалі абсьледваньне Алеўцкіх астравоў з мэтай высьветліць пытаньне аб магчымасьцях арганізацыі там паветраных баз.

Вялікія манэўры фран цускага паветранага флёту

ПАРЫЖ, 6 (ТАСС). Як паведамляе **«Юманітэ»** вядзецца ўзмоцненая падрыхтоўка да вялікіх манэўраў паветранага флёту ў Падэкале, Ліоне і Тулоне. У пачатку ліпеня ў Тулузе на манэўрах будуць прымаць удзел 90 самалётаў, якія правядуць паветраную бамбардыроўку. «Юманітэ» ўказвае, што ў сувязі з гэтым камуністы Тулузы заклікаюць рабочых арганізаваць камітэты супроць вайны на заводах і на вакзалах, а таксама заклікаюць рабочых - сацыялістаў да сумесных дзеяньняў.

Кампартыя Германіі мабілізуе масы да адпору фашысцкім байцам

БЭРЛІН, 8 (ТАСС). У сувязі з надыходзячай адменай забароны гітлераўскіх штурмавых батальёнаў нацыянал-сацыялістычнае кіраўніцтва праводзіць падрыхтоўку да назначанага на 2 чэрвеня ў Бэрліне выступленьня штурмавых фашысцкіх батальёнаў.

Кампартыя рыхтуецца да контрдэманстрацый, патрабуючы ад бэрлінскага паліцэй-прэзыдэнта Грэзэзінскага неадкладнага скасаваньня забароны дэманстрацыі. У выпадку скасаваньня забароны кампартыя правядзе 12 чэрвеня антыфашысцкую дэманстрацыю ў Люстэртэне. Рабочыя кварталы Бэрліну рыхтуюцца да самаабароны. На ўсіх вакзалах гарадзкіх чыгунак у Эсэне створаны арганізацыі антыфашысцкага саюзу, выбраны камітэты барацьбы супроць фашызму.

На канфэрэнцыі хэмічных рабочых Рурскай вобласьці пасьля абгаварэньня праграмы кампартыі па барацьбе з фашызмам створан камітэт адзінага фронту. Канфэрэнцыя выбрала двух дэлегатаў на Жэнэўскі антываенны кангрэс. Камітэт антыфашысцкага адзінства створан таксама на сходзе гарнякоў у **Вальдэнбургу** (Верхняя Сілезія). У яго ўвайшлі рабочыя камуністы, сацыял-дэмакраты, а таксама і беспартыйныя.

НОВЫ РУМЫНСКІ УРАД

ВЕНА. 6 (ТАСС). Згодна паведамленьня з Бухарэсту, пасьля няўдалай спробы Тытулеску стварыць урад нацыячальнай канцэнтрацыі, кароль да ручыў лідэру нацыянал-царанісцкай партыі Вайда-Вайводзе (франкофіл) стварэньне каліцыйнага ўраду лібэралаў і нацыянал-цараністаў. Аднак, лібэралы, якія пратэндавалі на сфармаваньне габінэту лібэральнай партыі, адмовіліся прымаць удзел у габінеце Вайда-Вайводы. У рэзультаце гэтага кароль даручыў Вайда-Вайводзе сфармаваць габінэт для правядзеньня перавыбараў пад кіраўніцтвам нацыянал-цараністаў і па магчымасьці з прыцягненьнем другарадных груп.

Вайда-Вайвода сфармаваў урад у наступным складзе: прэм'ер і міністар узуграных спраў—**Вайда-Вайвода;** міністар фінансаў і юстыцыі—былы прэм'ер член нацыянал-царанісцкай партыі **Міранэску:** вайсковы міністар, які займаў тую-ж пасаду ва ўрадзе Міранэску генэрал **Стэфанэска-Амза;** міністар гандлю і прамысловасьці—былы таварыш міністра сацыяльнага забесьпячэньня ўраду Міранэску, член нацыянал-царанісцкай партыі **Лугажану;** міністар шляхоў зносін—былы памесьнік міністра зямляробства ўраду Маніу, лідэр бэсарабскіх нацыянал-цараністаў **Потырка;** памесьнік міністра ўнутраных спраў па справах нацыянальных меншасьцяй — лідэр нямецкай партыі **Брандш,** які займаў тую-ж пасаду ва ўрадзе Іоргі. Адносна астатніх партфэляй Вайда-Вайвода вядзе перагаворы з лідэрам лібэральных дысыдэнтаў Георгам **Братыяну,** прапанаўючы апошняму партфэль міністра замежных спраў.

У палітычных колах зварачаюць увагу на пачатыя перагаворы Вайда-Вайводы з сацыял-дэмакратамі аб стварэньні выбарчага блёку і магчымым уцягненьні сацыял-дэмакратаў ва ўрад.

Сьпіс дакладчыкаў па правядзеньні растлумачальнай работы па рэалізацыі пазыкі 4-га завяршаючага году пяцігодкі

Завод імя Варашылава — Хацкевіч (НКФін), зав. «Бальшавік» — Абрамсон (НКФін), зав. «Камунар» — Кавальчук (Гарком), зав. імя Молатава—Грыцкевіч (Гарком), ф-ка «Кастрычнік» — Шпэктараў (Гарком), зав. «Ударнік» — Мееровіч (Гарком), абутковая ф-ка — Гершман (ЦКК), шклозавод—Лойка (ВАН), ф-ка «Камунарка» — Стракоўскі (Дзяржплян), Хлебазавод — Кеніг (Гар. КК), шчотачная ф-ка — Балабана (НКЮ), друк. імя Сталіна — Каждан (Гарком), Мясакамбінат — Рэзьнікаў (Гарком), Скарняжная — Кейлін (Дзяржбанк), ф-ка «8 сакавіка»—Адейшікаў (Дзяржбанк), ф-ка «Усход»—Кудраеў (ГСПС), ф-ка імя Крупскай — Алейнікаў (НКФін), ф-ка «Беларуска»—Бутырскі (НКФін), зав. «Беларусь» — Эйдлін (НКФін), Хэмфармзавод — Абрамаў (Гарком), зав. «Чырвоны Хэмік» — Шпакоўская (Дом Камасьветы), зав. «Пралетары» — Захарава (НКФін), зав. «Чырв. Зорка» — Булко («Работніца і Калгасьніца»), ф-ка «Чырв. Тэкстыльшчык»—Цыкін (газ. «Рабочий»), шпалерная ф-ка — Чарнякоў («Рабселькор»), лямпавая ф-ка — Карачун (газ. «Зьвязда»), Электрастанцыя — Фэльдмаят (Дзяржбанк), абутковая майстэрня — Воінаў (газ. «Зьвязда»), Уціль — Рутэнберг (ГК ЛКСМБ), УФА — Варонін (НКФ), Сьпіртзавод — Вушуеў (Дзяржбанк), Дом Ураду — Фрадзін (Гарком), УНРа — Ляхаў (НКФ), Менбуд — Шпалей (Гар.КК), цагельні Менбуду — Бальперын (Гарфа), цагельні Белдзяржбуду — Жалезны (Гар. апчад каса), ЦЭЦ — Міхайлаў («Калг. Беларусі»), Харчавікі — Скорман (Гар.КК), Саюзтранс — Дабрын (Гарфа), Транспартрэст — Брандабоўскі (НКФ), Дэпо — Шулькін (Гарпрафсавет), «Полымя Рэвалюцыі» —Валодзька (Гарсавет), Маны рамонт вагонаў—Мінц (Гарком), Эксплёатацыя — Бэрэін (ЦК чыгуначнікаў), служба шляху — Этле (упаўн. НК шляху), Самцрамсаюз — Старавойтаў (Гар.КК), Рэззрв: Шэрман, Байрашэўскі, Роззнгаўз, Кіст, Коваль, Брадэрман, Ленспэр, Дабравольскі, Гергыкаў, Азерскі, Шаткін, Шусер, Самуцін, Жабінскі, Вержбаловіч, Канаплін, Рудзіцкі, Фрадзін, Мацюкоў. Савецкія, вузаўскія ячэйкі вылучаюць дакладчыкаў самастойна.

—**Дом Камасьветы,** 10 чэрвеня ў 19 гадз (пакой № 24) адбудзецца група-вая кансультацыя для прапагандыстаў кандыдацкіх і першапачатковых школ і гурткоў на тэму «Вынікі першай і асноўныя задачы другой пяцігодкі».

ПАПРАЎКА

Ва ўчарашнай тэлеграме сакратара ЦК КП(б)Б т. Іванова апошні радок трэба чытаць: «сяўба ў асноўным будзе скончана **7 чэрвеня».**

12 чэрвеня 1932 г. у памяшканьні клюбу імя Розы Люксэмбург адбудзецца адкрыцьцё

ПЕРШАЙ УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ — ЧЛЕНАЎ КП(б)Б.

Парадак дня: 1. Даклад прэзыдыуму Ўсесаюзнага т-ва старых бальшавікоў. 2. Даклад аб рабоце аргбюро, плян работ і каштарыс Беларускага філіялу т-ва старых бальшавікоў на 1932 г. (т. т. Балцін, Кеніг). 3. Выбары.

Прысутнасьць усіх падпольшчыкаў — членаў КП(б)Б са стажам да 1916 г. уключна — абавязкова.

Члены КП(б)Б, ЛКСМБ, прадстаўнікі фабрык і заводаў і грамадзкіх арганізацый праходзяць па запрашальных білетах.

За атрыманьнем мандатаў зварачацца 11 чэрвеня ў памяшканьне гарКК (вул. К. Маркса) да т. Спалінскага, а 12 чэрвеня ў клюб імя Розы Люксэмбург з 5-ці гадз. вечара.

Для прыезных таварышоў начлег у 1-й савецкай гасьцініцы (рог Савецкай і Камсамольскай вул.).

10-VI ў 7 гадзін вечара ў памяшканьні рэдакцыі газэты „Зьвязда" (Савецкая, 63, трэці паверх, габінэт рэдактара) адбудзецца

пасяджэньне цэнтральнага кармовага штабу

па пытаньнях правядзеньня **сенаўборкі.**

На пасяджэньне з адпаведнымі матар'ыямі ў абавязковым парадку павінны зьявіцца прадстаўнікі: Наркамзему, Калгасцэнтру, Малаколгассаюзу, Сьлінводмалгассаюзу, Лугавога трэсту, Малаколпрэмтрэсту, трэсту Сьлінавод, Насентрэсту, Белпушкатрусводтрэсту, Садгародтрэсту, Сельгасбанку, Белкавпасаюзу, Белсельснабу, ЦП саюзу жывёлагадоўчых рабочых, ЦК ЛКСМБ.

„Зьвязда". Цэн-ни РСІ.

1-шы ўсебеларускі энэргетычны зьезд

адкрываецца сёньня ў 18 гадз.

у Доме Камасьветы (рог вул. Карла Маркса і Энгельса).

Францыя зьезду—у 17 гадзін там-жа.

Рэгістрацыя, выдача мандатаў і наўкоўваньне дэлегатаў у гасьцініцы ўтварацца ў бюро абслугоўваньня энэргазьезду з 9 да 15 гадз.—пляц Волі, 5, Дзяржплян, 3-ці паверх, пакой № 24, з 18 да 22 гадз.—у памяшканьні зьезду.

З 11 чэрвеня зьезд будзе працаваць у Доме Тэхнікі (Камсамольская вул. 6. клюб „КІМ").

АРГАНІЗАТЭТ.

СЁНЬНЯ, 10 чэрвеня, роўна ў 7 гадзін вечара, у памяшканьні летняга тэатру саду „ПРАФІНТЭРН"

адбудзецца

аб'яднанае пасяджэньне пленуму Менскага Гарадзкога Савету і Гарпрафсавету

з удзелам партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый і рабочых г. Менску.

ПАРАДАК ДНЯ:

Аб рэалізацыі новай пазыкі індустрыялізацыі 4-га заключнага году пяцігодкі.

Члены гарсавету, гарпрафсавету, ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, ЦВК, СНК, прэзыдыуму ЦСПСБ, гаркому КП(б)Б, КСМ, ГарКК праходзяць на сваіх мандатах. Рабочыя прадпрыемстваў і прадстаўнікі гарнізону—па запрашальных білетах, распаўсюджаных гарпрафсаветам.

ГАРСАВЕТ.

ГАРПРАФСАВЕТ.

10-га чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні ЦК КП(б)Б (заля пасяджэньняў)

СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА

кіраўнікоў сэктараў кадраў наркаматаў, цэнтральных устаноў і ЦП саюзаў, дырэктараў і сакратароў парткалектываў ВНУ і тэхнікумаў па пытаньні аб ходзе работы па складаньні другой пяцігодкі па кадрах.

Аддзел Кадраў ЦК КП(б)Б.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" АД 10 ЧЭРВЕНЯ

лепшы савецкі фільм (ЗУСІМ НОВЫ ЭКЗЭМПЛЯР)

ДЗЯЎЧЫНКА са СКРЫНКАЙ

У гал. ролях: В. Фогель, Коваль-Самборскі, Ганна Стэн і інш.

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ.

Пачатак у 6, 7-30, 9 і 10-30.

КАСА—ад 4 гадзін.

ДЗЕЦІ У КІНО НЕ ДАПУСКАЮЦЦА

АНОНС! Гэтымі днямі БЕЛДЗЯРЖКІНО ВЫПУСКАЕ НОВЫ ФІЛЬМ УЛАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

ПОНАР

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **НОРД-ОСТ** Звыш праграмы кіно-хронікі.

ПРАЛЕТАРЫ Осі Асвальд у камэдыі **Гэта мой жаніх** у 7 частках

СПАРТАК Пач. 7, 9, 10-45 Каса—ад 5 г. з 10 чэрвеня МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **МАСКА САРВАНД** Драма ў 7 частках.

ЛЕТНІ ТЭАТР саду „ПРАФІНТЭРН" ДАМЭЦ СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА эстрадна-цырковыя паказы **МЮЗІК-ХОЛ** у 3-х адд.

Сёньня—закрыты паказ для Гарсавету

Сёньня, у 7 гадз. веч., у агульнай залі БАН адбудзецца **ДАКЛАД** нам. дырэктара праф. **Н. М. Матарына** —аб выніках Усесаюзнай нарады па этнаграфіі народаўсёй

Запрашаюцца ўсе навуковы працаўнікі, выкладчыкі гісторыі, студэнты, супрацоўнікі ін-ту гісторыі і ўсе жадаючыя.